ГУЛЬНЯ З АГНЁМ

Яўгенія
ЛЯЗО

Хай дабраславіць Гасподзь тых людзей,
якія дапамаглі выдаць кнігу

УДК 82-1
ББК 84-5
Л97

Л97 **Лязо Яўгенія**
Гульня з Агнем / Яўгенія Лязо. — [б. м.] : Издательские решения, 2024. — 180 с.
ISBN 978-5-0064-3159-1

УДК 82-1
ББК 84-5

Часта мы раздзяляем гісторыю і сучаснасць, забываючы, што другое выцякае з першага. Так і жыццё чалавека: нас фарміруе тое, што мы зрабілі раней. Таму важна ўмець кіраваць сабой, будаваць сваю будучыню, бо з нашых лёсаў і складаецца гісторыя краіны. Кнігазбор “Гульня з агнём” распавядае пра жыццёвыя дарогі беларускіх хрысціян, якія перажылі многія пакуты, але не страцілі душы.

18+ У адпаведнасці з ФЗ ад 29.12.2010 №436-ФЗ

ISBN 978-5-0064-3159-1
© Яўгенія Лязо, 2024

Замест прадмовы

Многа настаўнікаў бачыла ў дні
вандравання зямнога.
Мала знайшлося руплівых і добрых
айцоў і бацькоў.
Тыя, каго не сустрэць у супольнасцях
важных і сходах,
Часта не маюць увагі вялікай сярод сваякоў.
Іх прапускаюць, не бачаць, не любяць
так моцна, як тых,
Хто пра сваю ганарыстую славу
трубіць напаказ.
Выправім гэта ў прадмове, якую
цяпер прысвячаю
Роднаму мне шаноўнаму прафесару
Алесю Бельскаму,
Бо найкаштоўнейшы ўнёсак зрабіў
у студэнтаў філфака.
Прысвячаю прадмову любімаму пастару
Генадзію Стульбу:
Дзякуй за Ваша цярпенне
на гэтым адказным шляху.

ЦЕНЬ ЧОРНАГА БУСЛА

«У любові няма страху,
А дасканалая любоў праганяе страх,
Бо ў страху ёсць пакута,
Хто баіцца, той не дасканалы ў любові.
Будзем любіць Яго, бо Ён раней палюбіў нас»

1 Яна 4:18–19

Акт 0

ЗАМЕСТ ПРОЛАГУ

«Ён вызваліў душу маю ад магілы,
І жыццё маё бачыць святло»

Ёва 33:28

Маё сэрца астывае ў халодным зімовым начным лесе. Я пайшоў крывой сцежкай, згубіўся, цяпер расплачваюся за сваю памылку жыццём. Ледзяная гурба — вось мой апошні прытулак зямнога вандравання. Тое, што я заслужыў. Марудна канаю. Страшна. Страшна халодна паміраць. Аднаму. І ніхто не прыйдзе на дапамогу… ці ўсё-такі прыйдзе?

На фоне зорнага неба бачу роднае святарскае аблічча. Гэта айцец Алесь свеціць мне тэлефонным ліхтарыкам у твар.

«Жывы!» — уздыхае стары святар.

Не кінуў свайго юнага дзяка ў лесе.

Спрабуе падняць. Не атрымліваецца. Халадэча скавала мае рукі і ногі так, што я іх не адчуваю. Знясілены доўгімі пошукамі Алесь валіцца пад асіну ў снег.

Трэба сказаць, што наш трывалы мужны святар ніхто іншы, як жанчына. Гэта вялікая тайна, што настаяцель мінскага сабора не Алесь, а Алеся. Яна не вынесе з лесу на кволых плячах хлопца.

«Патэлефануй…» — хрыпла прашу яе.

«Сувязь не ловіць», — спакойна адказвае святар.

«Тады сам... сама шукай паратунку. Ты ж загінеш!»

«І пакінуць сваю авечку? Не».

Скрозь цёмныя дрэвы набліжаецца зорачка. Цяпер гэта тэлефон айца Кандруся, біскупскага намесніка і роднага брата Алеся... Алесі. З-за ягонай шырокай спіны выглядвае кволы айцец Станіслаў.

«Чаго прылеглі? Жыць неахвота?» — бурчыць айцец Кандрусь.

Яго твар раздзяліў напалову інсульт: правая частка заўсёды жвава-рухавая, левая — мёртвая.

«Падымайся, Алесь», — Кандрусь штурхае святара ў плячо.

Настаяцель паказальна апускае галаву, даючы зразумець, што ўсё скончана і яму не падняцца.

«Словы намесніка табе пусты гук?» — гневаецца Кандрусь распалавіненым тварам.

Алесь робіць намаганне, падымаецца.

Кандрусь безудзельна адварочваецца ад яго, ідзе да мяне. Страшна. Аказацца слабым у вачах намесніка больш страшна, чым ляжаць сам-насам са смерцю.

Кандрусь моўчкі прыхапіў мяне за плечы і на пару з айцом Станіславам узваліў на сваю спіну. Нешта плюхнулася ў снег.

«Што гэта?» — непакоіцца Станіслаў.

Святары павярнуліся. Гэта Алесь ізноў паваліўся тварам у гурбу. Кандрусь перадае мяне Славу, сам шыбуе праз снег да Алеся. Сядае перад ім.

«Даруй. Я не выканаю твой загад», — памірае Алесь.

«У цябе баліць сэрца?» — непакоіцца Кандрусь.

«Хіба гэта важна?»

«Важна», — Кандрусь кладзецца ля дарагога яму чалавека.

Айцец Станіслаў змог данесці мяне. Але Кандрусь і Алесь не выйшлі з абдымкаў смерці.


Slag 3:16

Акт 1

СЭРЦА СВЯТАРА

«Сэрца цара ў руках у Госпада»

Выслоўяў Саламонавых 21:1



Дзея 1
Погляд старога біскупа

Я прачнуўся пасля цяжкай ночы, у якую працаваў над новай аповесцю. Лежачы на ложку, захінуўшыся ў коўдру, прыходзіць на памяць сон, які прысніўся мне за гэтыя дзве гадзіны, калі я спрабаваў выспацца. Ніяк не магу сабрацца з думкамі і ўспомніць яго. Спадзяваючыся, што згадаю сон пазней, апранаюся.

Чорныя порткі, кашуля, каларатка, сутана — гэта адзенне належала старому майму папярэдніку ксяндзу Кандрусю. Прайшло многа часу з той страшнай ночы, калі ён памёр разам з айцом Алесем.

Ложак, пісьмовы стол, шафа з Бібліямі — увесь Кандрусёвы набытак, што перайшоў мне ў спадчыну. Уласна майго тут толькі ноўтбук ды гітара.

На стале — сціплы фотаздымак Кандруся ў чорнай сутане, поруч з ім стаіць у белым мой біскуп Пятрусь (ён просіць называць сябе менавіта так). Яны разам выглядаюць як шахматная дошка. Айцец Пятрусь простым голубам прытуліўся да змрочнага сябра сваёй маладосці. Святар Кундрусь варожа глядзіць спадылба, прама на мяне, прытрымліваючы біскупскую спіну, нібы абараняючы Петруся ад чужых вачэй. Чорны раёк вострага погляду зліваецца з бровам, агаляючы асляпляльны бялок. Акуляры блішчаць на святле белым шклом і падаецца, што ў святара не два вокі, як ва ўсіх нармальных людзей, а чатыры. Гэта надае яму падабенства з павуком.

Фота з’явілася на стале ўжо пасля смерці айца Кандруся: ён не любіў фатаграфавацца і захоўваць свае выявы. Фотаздымак нядаўна паставіў на стол айцец Пятрусь у памяць пра страшнага свайго сябра-анёла. Сапраўды, гэтага злога-добрага святара баяліся астатнія царкоўнікі і старанна пазбягалі служыць з ім імшы. Ласкавы ён быў толькі з айцом Петрусём, таму і быў біскупскім намеснікам да смерці, бо толькі біскуп ды дзеці не баяліся Кандруся: ён ніколі нікога не пакрыўдзіў, і яны гэта патаемным пачуццём адчувалі.

Кандрусь! Вось, хто мне сніўся! Бягу ўніз па лесвіцы на кухню: трэба расказаць біскупу пра гэта.

Айцец Пятрусь прачнуўся раней за мяне. Гэты мякенькі стары мужчына ў белай начной кашулі і ў портках зранку стаіць на кухні, гатуе яечню, старэчымі дрыготкімі рукамі ставіць дзве талеркі на стол.

Падбягаю, абдымаю мяккія грудзі і спіну кволага чалавека. Кандрусь на маім месцы ніколі не дазволіў бы сабе такой фамільярнасці: намеснік даваў волю пяшчоце толькі тады, калі Пятрусь да яго падыходзіў першым. Біскуп браў старэчымі сухімі далонямі крывы твар сябра і цалаваў перакошаныя вусны. Строгія вочы Кандруся любоўна закатваліся, намеснік атрымліваў асалоду. Наколькі айцец Кандрусь быў страшны з людзьмі, роўна настолькі ён мякчэў пры Петрусю.

«Ты ўжо прыгатаваў?» — я застагнаў праз крыўду на сябе самога, бо слугаваць старому айцу — мой святарскі абавязак.

«Не хацеў цябе будзіць. Ты ўсю ноч пісаў», — лагодна прамаўляе Пятрусь.

Ён накладвае яечню на талеркі. Молімся. Сядаем.

«Хачу табе паказаць адну рэч, — біскуп узяў з падаконніка нейкі аркуш. — Запавет. Я пакіну табе ўсё, што маю: наш дом, машыну, усе грошы (не тое, каб было іх зусім многа)».

Я знерухомеў:

«Ты збіраешся памерці?»

Айцец уздрыгануўся: ён не чакаў, што я скажу гэта.

«Змітро, — стараючыся сабрацца з думкамі, адказвае біскуп, — ты ведаеш, што аднойчы я памру. І ты памрэш, але з табой заўсёды будзе Хрыстос».

Я закрываю рукамі твар, усхліпваю:

«Мне не патрэбна маё жыццё, калі не будзе са мной майго святара. Навошта мне дом, калі тут не ўбачу цябе?»

«Хлопча, — біскуп па-бацькоўску бярэ мае худыя рукі, — хлопча, ты будзеш забяспечаны матэрыяльна да канца жыцця, калі будзеш жыць настолькі сціпла, як цяпер. Ты мог бы нават не працаваць! Хіба гэта не дар? Ты будзеш ксяндзом не таму, што табе неабходна выжываць за грашы, а таму, што ты хочаш Богу паслужыць!»

Узрушаны айцец Пятрусь робіць паўзу, працягвае:

«Ты заслужыў гэта. Ты ахвяраваў найлепшыя гады свайго юнага жыцця старому святару, калі мог піць і гуляць, як робяць гэта твае равеснікі. Я хачу аддзячыць табе!»

Я разрыдаўся. Пятрусь сардэчна гладзіць маю галаву:

«Я хацеў бы аддаць табе біскупскую пасаду, — ледзь чутна ён прамаўляе, — але ты ведаеш, што астатнія служыцелі дрэнна паставіліся да таго, што я пасвяціў цябе ў святары, бо табе яшчэ няма трыццаці. Не думаю, што яны згадзяцца зрабіць цябе біскупам».

«Яны ненавідзяць нас, таму пастараюцца пазбавіцца ад мяне адразу пасля тваёй смерці!»

«Не пазбавяцца», — айцец гладзіць маё плячо.

Знянацку прыкмячае адну важную дэталь:

«На табе адзенне Кандруся! Ці не ў гэтай сутане ён памёр?»

Я схамянуўся:

«Не, у іншай... пачакай, ты ласкавы са мной, а перад тваімі вачыма стаіць Кандрусь. Ты толькі тады пяшчотны, калі я апрануты ў ягоную вопратку!»

Біскуп спалохаўся, бо сказанае мной аказалася праўдай. Ён апраўдваецца:

«Ты такі ж ласкавы, як Кандрусь».

«Ты хацеў сказаць, такі ж страшны, як айцец Кандрусь, — абураюся я. — Страшны, і табе гэта падабаецца, бо ты — ласкавы стары чалавек, і табе хочацца, каб цябе любіла такая змрочная разумная істота, як…»

«…як Зміцер Гільятэн!» — грандыёзна вымаўляе біскуп мой літаратурны псеўданім.

Я палохаюся, схамянуўшыся працягваю дэкламацыю:

«...я хацеў сказаць пра айца Кандруся... Мяне ненавідзяць у царкве, як гэта было з ім».

«Я любіў яго», — строга адказвае біскуп.

«Ты не любіш мае творы, бо я іх пішу на аснове тваіх страшных аповедаў».

«Творы Кандруся я любіў».

«Табе проста падабаецца кампанія маладога чалавека».

«Але Кандрусь быў старым».

«Кандрусь-Кандрусь-Кандруь! І гэтак цэлымі днямі я чую ад цябе ў свой адрас!»

Біскуп замкнуўся, пераможвае яечню. Яшчэ некаторы час моўчкі сядзім за сталом. Я супакоіўся, хаця шчокі мае яшчэ не высахлі. Мне сорамна за сваю дзёрзкасць:

«Ведаеш, мне айцец Кандрусь прысніўся».

Біскуп прасіяў:

«Цяпер ты мне будзеш пра Кандруся казаць».

Я чырванею:

«Даруй мне. Я буду спрабаваць паўтараць за табой, як ты паўтараеш за Хрыстом. Дакладна ведаю, што ў сне гэта быў ён, хаця не бачыў яго твару (я забыўся ўдакладніць, пра каго кажу: пра Хрыста альбо пра айца Кандруся). Ён падаў мне руку для пацалунку, і мне падалося, што ў руцэ павінны быць духмяны хлеб. Але ў далоні нічога не было, тады я ўразумеў, што рука — гэта і ёсць хлеб».

Айцец размяк, на шчацэ блішчыць сляза:

«Змітро, я расказваў пра тое, як памёр Кандрусь?»

«Гэта твая любімая гісторыя. Але з кожным тваім аповедам я знаходжу ў ёй тое, чаго не бачыў дагэтуль».

Біскуп склаў рукі на грудзях, задуменна пачаў глядзець некуды ўніз, падставіўшы пад кухонную лямпу галаву з сівым курчавым пухам:

«У тую ноч, калі Алеся і Кандруся прывезлі з лесу ў бальніцу, я прыляцеў да іх. Алесь даўно памёр, а Кандрусь змагаўся за жыццё. Ён ляжаў, задыхаўся. Кандрусь урачыста глянуў на мяне, калі я ўвайшоў. Я заўважыў, што ён хацеў пацалаваць маю руку. Кандрусь чакаў, што я ўкладу пальцы ў раскрытую ягоную далонь. Я не працягнуў пальцы пад самлелыя Кандрусёвыя вусны, бо не пасмеў прыняць яго цалаванне. Слабы, ужо амаль нежывы святар спалохаўся:

„Ты разлюбіў мяне?“

Я спахапіўся:

„Што ты! Я…“ — я хацеў быў яму патлумачыць, якія цяжкія пачуцці адчуваю, але не думаю, што ён пачуў бы мяне.

Таму я схіліўся і пацалаваў здранцвелыя Кандрусёвыя пальцы. Ён паглядзеў на мяне млявым поглядам і дробна задыхаў. Я паклаў сваю далонь на ягоны худы жывот, і яна ўздымалася праз стомленае дыханне яшчэ не мёртвага, але ўжо нежывога чалавека. Адзінае, што цяпер я мог зрабіць для яго — развязаць каларатку. Верагодна, яму б стала прасцей дыхаць… Адданы Богу Кандрусь заўсёды спаў у сутане і нават цяпер, у бальніцы, ніхто не пераапрануў яго, чакаючы ягонай хуткай смерці.

„Цяпер ты свабодны... свабодны бусел“, — так я сказаў Кандрусю, развязаўшы каларатку… Дарэчы, вось і яна. Заўсёды нашу яе разам з вершамі Кандруся».

Біскуп дастаў з кішэні каларатку і сшытак. Я ведаю гэты нататнік: Пятрусь часам чытае вершы Кандруся. Усе гэтыя гады ён жыве даследаваннем твораў свайго спачылага сябра.

Біскуп пачынае:

«Ты расплаўлены маёю любоўю,
Уздымаеш шэрыя вочы ўгору.
Растаяў каханнем гарачай далоні,
Мнешся дыханнем грудзей ласкавых.
Кожная казань святая твая
Агнём азавецца ў сэрцы рухавым».

«Гэта ён пра цябе?»

«Напэўна», — біскуп таямніча хавае шэрыя вочы пад павекамі.

«І ён табе гэта чытаў?»

Біскуп узрушыўся:

«Што ты! Ніколі! — айцец падграбае мяне да ласкавых разамлелых грудзей: — Ён хаваў іх ад мяне, ды я ж усё роўна ведаў, што ён піша: у нас у доме кепская гукаізаляцыя, а Кандрусь любіў прыдумляць творы, услых шукаючы рыфму».

«Яшчэ можна?»

Біскуп чытае:

«Штодзень ты ўзнімаеш сваё аблічча ў малітве да Бога, і я таю, як царкоўная свечка, праз цеплыню агеньчыка, што гарыць на ёй. Гэты палымяны

кнот, што праходзіць праз усю маю васковую ўнутранасць — Божае слова. Я гатовы згарэць Ягоным агнём».

Я апамятаўся:

«Такое нельга пісаць!»

«Хіба? Табе ж падабаецца! Ці ты ўжо не паэта?»

«Падабаецца, — уздыхаю я, — ды людзі не зразумеюць».

«Няхай! Толькі ты нікому не кажы пра гэтыя вершы».

«Можна мне сшытак?»

Айцец аддае мне сшытак. Гартаю. Чытаю:

«Маё сэрца аддана Табе назаўжды,
Не пераступіць душа старажытнай мяжы.
Жыць хачу я па праўдзе,
Дыхаць паветрам грудзямі,
Быць рабом і слугою
Да спачыну майго,
Да апошняга ўздыху.
Я мару пакласці ахвярай сваю душу,
Каб Твае вочы глядзелі на мяне задаволена».

«Кандрусю! — на шчацэ біскупа бліскае сляза. — Абмарожаны, ужо ў бальніцы, ён ніяк не паміраў. Алесь памёр, а ён — не. Мучыўся, пакуль я не перахрысціў яго і не прачытаў яму з Евангелля: „Мацуйся, сыне! Даруюцца табе грахі“. Ён нават памерці без дазволу не змог. Сапраўдны Хрыстовы раб!»

«Тут на вокладцы тваім почыркам напісана: „Мне страшна было бачыць тое, як душа пакідае тваё

цела. Цела, якое слугавала майму целу, і адпусціць душу, якая цешыць маю душу“».

Біскуп ажыўляецца:

«Так, гэта я напісаў. Ён не мог служыць са мной набажэнствы, бо калі здаралася зачапіць яго сутанай ці ўсміхнуцца, у яго круцілася галава. А я любіў спаць у Кандруся на грудзях, асабліва, калі нейкая паездка, — успамінае біскуп. — Тады Кандрусь часам здымаў акуляры і грыз дужку, салодка паглядаючы мне ў вочы, пакуль я не засну. Калі я засынаў і ён думаў, што я не чую яго, ён ласкава пачынаў гладзіць мяне, шэпчучы рознае мяккае…»

«Біскупе, цяпер я шкадую, што не адчуваю да цябе нічога падобнага».

«Але ты любіш мяне, і гэта — галоўнае».



Дзея 2
Варфаламееўская ноч

«Я разумею цябе, біскупе. Памятаю, як у снезе паміраў наш айцец Алесь. Не шкадую ні дня, праведзенага побач з ім… з ёй.

Не сказаць, што маё жыццё нечым надта адрознівалася ад лёсаў іншых служыцеляў. Скажу толькі, што ў адрозненне ад многіх іншых царкоўных равеснікаў, я дужа палюбіў айца Алеся. Калі ён яшчэ не быў настаяцелем Архікафедральнага сабора на Нямізе, а служыў у Чырвоным касцёле, я са сваёй электрагітарай мітынгаваў ноччу на праспекце Незалежнасці разам з тысячамі... Граў, пакуль народ асвятляў тую зорную ноч тысячамі ліхтарыкамі тэлефонаў. Дзеля гэтых імгненняў я пераклаў песню вядомую сярод нашых бацькоў:

„Свабода, свабода, як многа, як мала
Ты нам расказала пра лёсы народа.
Няпраўдзе і смерці, жыццю не здаешся,
Як неба пад сэрцам, ў тузе маёй б’ешся“.

Цяпер я сек тую ноч гукамі старой песні. А потым пад’ехалі варанкі і я разам з натоўпам кінуўся ўцякаць. Грукатала як на вайне, падалі людзі, іх білі іншыя людзі ў балаклавах. Знянацку з касцёла з’явіўся святар. Гэта і быў Алесь. Гучна ён паклікаў нас за сабой, і народ кінуўся ў царкву. Алесь зачыніў дзверы прама перад мной і людзьмі ў балаклавах, якія ўжо мяне схапілі. Але святар не пакінуў мяне на згубу: учапіўся мне ў грудзі, падставіўшы сябе пад чужыя рукі, і большасць удараў дручком прыйшлося

па Алесю. Памятаю чырвоную кроў на чорнай сутане. Чорнае цела на шэрым асфальце ў лужы чырвонай крыві і белае святло начных ліхтароў…

Тым часам дзверы касцёла ўзламалі людзі ў балаклавах. Але яны спалохаліся натоўпу, які хлынуў з царквы. А я з раскрамсаным Алесем ляжаў у лужыне нашай змяшанай разам крыві, пакуль чорныя рукі не кінулі нас у варанок.

Ачунялі мы ў камеры, напханай жывымі людзьмі. Я пачаў спяваць:

„Свабода, свабода, як многа, як мала…“

Зламаны Алесь нечакана для ўсіх працягнуў:

„Свабода, свабода…

Аб ёй мне будзіць успамін

На ліпе бусел клёкатам“.

Толькі тады многія заўважылі святара пад сваімі нагамі. Ён сам падняўся. Камера сціхла. Усе вочы — на айца. Алесь не мог многа гаварыць, моцы хапіла, каб заззяць:

„А дзе Дух Гасподні, там свабода!“ — і паваліцца непрытомным.

Я баяўся, што ён памрэ. Усё праз мяне!

Мы адседзелі некалькі сутак, а потым нас з айцом Алесем, як і многіх, выставілі за дзверы. І мы пайшлі…

Але КДБ не забыла тое здарэнне. Чырвоны касцёл хутка зачынілі, і нас з айцом перавялі ў Архікафедральны. Але і туды дабралася тыя-хто-трэба.

Калі гэтыя людзі прыехалі ў сабор, вернікі і святары раптам зніклі. Застаўся толькі я з айцом Алесем. Ён стаяў на каленях, і я стаў на калені побач.

„Ты хочаш піць са мной з адной чары?“ — святар не глядзеў на мяне.

Я кіўнуў, але ён не бачыў.

Увайшлі супрацоўнікі:

„Поехали“, — сказаў адзін з іх.

„Пасля імшы“, — спакойна адказаў настаяцель.

„Никому не нужна ваша имша. Все разбежались!“

„Богу патрэбна“.

Супрацоўнік схапіў Алеся. Няшчаснага настаяцеля пацягнулі ў машыну.

Айцец Алесь з’явіўся толькі праз тыдзень пасля доўгіх тваіх, біскупе, перамоў. Ён раптам прыйшоў у касцёл і паваліўся на апошнюю лаву. Кандрусь замяняў настаяцеля ў гэтыя нялёгкія для сабора дні, ён жа першым убачыў яго. І цяпер памятаю, як спалоханы, але ласкавы Кандрусь грэў Алеся на грудзях. А Алесь, паўпрытомны, ляжаў на лаве, акунуўшы твар у братава сэрца. Астатнія святары пачалі збірацца вакол.

„Вунь адсюль!“ — лязгнуў зубамі ўзрушаны Кандрусь.

Пакрыўджаныя знявагай біскупскага намесніка, ксяндзы пайшлі з касцёла. Толькі я застаўся. Я чакаў, што мяне не ўхваляць астатнія служыцелі. Так яно потым і здарылася.

Аднойчы я прыехаў да вас у госці, каб пабачыць хворага Алеся. Пакуль Кандрусь завіхаўся над братам… сястрой, у дзверы пазванілі. Я адчыніў. На парозе — два біскупы. Яны, карыстаючыся сваёй пасадай, пачалі павучаць мяне, што здарма я падтрымліваю айца Алеся і г.д. Я напалохаўся.

Мне на дапамогу прыйшоў Кандрусь і ўзяў усю віну на сябе, маўляў, гэта ён ва ўсім вінаваты і гэта ён (і толькі ён!) падбіў юнага неразумнага мяне застацца з Алесем у касцёле. І тут біскупы наваліліся на яго, намесніка. І адчыталі яго, як дурнога школьніка. А ён стаяў і маўчаў… маўчаў, пакуль стрэс і стома не ўзялі сваё і ён не паваліся непрытомны. Добра, што я паспеў падхапіць яго, і Кандрусь не стукнуўся аб падлогу.

На шум прыйшоў ты. Убачыў мілага свайго Кандруся, якога я прыводзіў у прытомнасць. Ты схапіў яго, ласкава прытуліў да сябе. Кандрусь расквітнеў, узгробся на ногі. Я па тваёй просьбе завёў яго у пакой да Алеся.

Пакуль ты лаяў калег-біскупаў (гэтаму мы вельмі здзівіліся, бо ты заўсёды з усімі добры), Кандрусь прылёг побач з нямоглым Алесем, у якога дрыжалі рукі. Пасля затрымання настаяцель замкнуўся і цяжка хварэў: задыхаўся і ў яго балела сэрца.

„Гэта з КДБ вобыск?..“ — ледзь вымавіў ён.

„Што? Не, не вобыск. Гэта біскупы“, — бераўліва адказаў Кандрусь.

„Па маю душу?..“

„Па маю“.

„Шчэ горш, — выдыхнуў Алесь. Ягоны голас ласкава гурчаў да брата: — Зефір… Мой салодкі зефір“.

На твары Кандруся змяшаліся несупаставімыя пачуцці: ён цукрам раставаў праз ласку Алеся і разам з гэтым адчуваў турботу за яго.

„Кнот, — сумна ўсміхнуўся Кандрусь праз шкло акуляраў. — Кнот, які сыплецца праз агонь родных абдымкаў“.

Кандрусь узмахнуў рукавамі сутаны, як аграмадная чорная птушка, і ўзяў у абдымкі няшчаснага Алеся. Толькі цяпер я ўбачыў ледзяны пот на ліхаманкава-жоўтых упалых шчоках настаяцеля. Ён дробна дыхаў, і бачна было, што з кожным уздыхам сэрца насаджваецца на шыла, якое працінае і Кандрусёвае сэрца. Ён трымаў халодныя рукі Алеся, якія дрыжалі праз невыносны боль: ксёндз змагаўся са смерцю. Ён знайшоў сілы расплюшчыць сінія вочы і ўсміхнуцца брату. Але гэта яшчэ больш напалохала Кандруся: ён стаў падобным да дзіця: вялікія чорныя вочы з вось-вось праступіўшымі празрыстымі слязамі. І вусны… Нерухомыя спакойныя вусны, поўныя неразумення.

„Жоўты… жоўты Пецярбург, — выдыхае Алесь, — няшчасны жоўты гестапаўскі дурдом…“

Я не заўважыў, як ты ўвайшоў. І Кандрусь і Алесь у маўклівым захапленні павярнуліся да цябе: памятаю, ты быў абурана-мілы пасля лаянкі. Алесю быццам стала лепш, а Кандрусь знайшоў сілы паваліцца перад табой на калені, хаця ў яго амаль не гнуліся хворыя ногі. Ты ахвотна падаў руку з пярсцёнкам для пацалунку. Святар млява ўзяў тваю далонь, біскупе, у сухія пальцы. Ён не мог адарваць свае вочы ад тваіх вачэй: боль за Алеся і захапленне табой з’ядналіся ў адно. Кандрусь не вытрымаў твайго рахманага погляду: сціпла апусціўшы галаву да старэчых тваіх пальцаў, атрымаў асалоду ад пацалунку. А ты ласкава зірнуў на яго:

„Кандрусю, зрабі ласку, зашпілі гузік. У мяне рукі дрыжаць“.

Трымаючы ўнутры захапленне, Кандрусь сам з дрыготкімі рукамі прыняўся за выкананне. Алесь пяшчотна пасмейваўся:

„Што, Кандрусю, біскуп настолькі трапяткі і круціць табе галаву, што ажно рукі дрыжаць? Ты б згадзіўся зашпіліць сотню гэтых гузікаў, каб толькі стаяць перад сваім шаноўным айцом на каленях і мацаць жывот Петруся, — Алесь зрабіў паўзу. — На жаль, у сутане не знойдзецца сотні гузікаў, але табе б хапіла зашпільваць сотню разоў адзін і той жа“.

Потым ты стаў на калені перад Алесевым ложкам, гладзіў зграбныя тонкія рукі святара:

„Добра, што мы паспелі даслаць у Еўропу нашых украінскіх сяброў“.

Бежанцы жылі тут каля месяца. Памятаю, я граў ім свой пераклад:

„Перамен прагне знясілены дух,
Перамен прагне нязломлены рух,
Ў нашым смеху,
у нашых слязах,
у пульсацыі вен —
Перамен, даеш перамен!“

Украінцам спадабалася. Але Алесю было непрыемна чуць ад мяне гэту песню. Пасля майго выступлення настаяцель узяў мяне пад руку і павёў на паветра. Памятаю, ідзём уздоўж Свіслачы.

„Што такое восень — гэта камні,
Любасць над счарнелаю Нямігай…“

„…Нявою“, — буркнуў Алесь.

„Што?“

„У Шаўчука была “верность над чернеющчей Невою”“.

„Так, сапраўды, а я што спеў?“

„А ты пра Нямігу, — стары настаяцель стомлена качае галавой. — Эх, пабудаваны на костках Пецярбург… маладзейшы за Мінск, а столькі жыццяў унёс, як наша крывавая сталіца. Ерусаліме, Ерусаліме, што забіваеш прарокаў і каменнем пабіваеш пасланых да цябе! Колькі разоў хацеў Я сабраць дзяцей тваіх, як птушка збірае птушанят сваіх пад крылы, і вы не схацелі!“.

„Адкуль ты так добра ведаеш тэкст гэтай песні? Ты ж яе не любіш“.

„Хлопча, былі часы, калі і мы былі маладыя, свежыя і шчырыя. Тады мы спявалі гэтыя песні. Даспяваліся… за кожным новым ірадам ідзе яшчэ злейшы новы ірад. А ўкраінцаў трэба адправіць у Польшчу. Хутка“.

Нядоўга Кандрусь і Алесь пражылі пасля тых падзей. Калі мы паехалі ў вясковы касцёл, дзе я вырашыў ноччу адзін зрэзаць дарогу па лесе, то яны, хворыя і стомленыя, пайшлі шукаць мяне разам з айцом Станіславам».

Біскуп сядзіць, з вачэй капаюць слёзы.

«Дарэчы пра Станіслава, — абуджаецца айцец Пятрусь. — Трэба яго з бальніцы забраць».

Акт 2

ЦЕНЬ СЯБЕ САМОГА

«Бо нашыя дні на зямлі — цень»

Ёва 8:9

Дзея 1
Айцец Станіслаў

Мы з біскупам едзем у нашай машыне з прыгарада ў Мінск. Кожны раз, калі я вяртаюся ў свой родны горад, адчуваю няпэўнае пачуццё патрыятызму, змяшанае з жахам. На люстры, на якой калышацца ружанец, я бачу слабога ласкавага старца-біскупа, што сядзіць на заднім сядзенні і задуменна глядзіць на адлігу. Само сабой вырываецца з майго сэрца ледзь чутна:

«Белы снег шэры лёд,
На сухой патрэсканай зямлі.
Раскіданы у клетках па ёй —
Горад ў дарожнай пятлі.
А над горадам аблокі плывуць,
Закрываюць святло нябёс.
А над горадам жоўты дым,
Горад у стагоддзях пранёс
Зорку, што стаміла святлом,
Па імені сонца».

Мы прыехалі ў бальніцу, каб забраць айца Станіслава. Гэты стары худы чалавек з мяккімі ломкімі курчавымі валасамі і выцвілым поглядам ледзь не памёр праз апендыцыт праз ксяндзовую няўважнасць.

Яго, непрыкметнага святара, у касцёле забывалі ўсе. Забывалі ўзяць у паездку, забывалі кудысьці паклікаць, забывалі ягонае прозвішча і імя па бацьку. Аднойчы айцец Міхал не мог знайсці ў касцёле Станіслава:

«Дзе гэта шэрая плесня!» — вылаяўся ён, не заўважыўшы, што Станіслаў стаіць побач.

Таму, калі ў айца Станіслава некалькі дзён назад здарыўся апендыцыт, ніхто не звярнуў на гэта ўвагу, нават ён сам. Два дні з болем у жываце служыў імшы і спавядаў вернікаў. А потым яго, хворага, убачыў мой біскуп, з якім мы дагэтуль былі ў ад'ездзе. Ён сарваў няшчаснага Станіслава з набажэнства ў бальніцу. Хворага ксяндза тэрмінова паклалі на аперацыю.

«Яшчэ б адзін дзень пахадзіў, тады б памёр ваш святар», — сказаў нам хірург пасля аперацыі.

Але ніхто б не заўважыў, калі б айцец Станіслаў памёр.

Цяпер мы прыехалі забраць нашага святара. Яго ложак стаіць у самым куту палаты.

«Святаруша, это за тобой!», — азваліся пацыенты, убачыўшы нас з біскупам.

Станіслаў адарваў ад глыбокай падушкі жоўтую галаву на сухой птушынай шыі. Вочы расплюшчыліся, упусціўшы ў шэры раёк халоднае святло, якое звузіла чорныя талерачкі зрэнак. Ён не паверыў на свае вочы. Біскуп апусціўся на ягоны ложак, узяўся за худое плячо няшчаснага айца Станіслава.

«Чаму вы прыехалі? Я няправільна зрабіў справаздачу… Я абавязкова перараблю. Вінаваты, даруйце».

Біскуп спахапіўся:

«Што ты, якая справаздача? Ты ж ледзь не памёр!»

«Слава Богу, што не памёр, інакш маю няправільна выкананую працу прыйшлося перарабляць камусьці іншаму…»

«Ксёнджа, угаманіся», — біскуп у зубы цалуе Станіслава.

Хворы святар разамлеў:

«Вы прыехалі не караць?» — хлопае вачыма, якія ўжо пачалі напаўняцца шчасцем.

«Мы завязём цябе дахаты», — адказваю я.

«Атрымліваецца, вы мяне… — Станіслаў набірае ў грудзі паветра, — …любіце? Госпадзе… — вочы ксяндза забегалі, на шчацэ з'явілася сляза, — …я прасіў Цябе пра смерць, каб не прыйшлося вяртацца ў касцёл».

Біскуп абхапіў няшчаснага святара:

«Зараз Зміцер завязе цябе дахаты. Змітро, калі ласка, дапамажы нашаму сябру апрануцца».

Я глянуў на гэты шэры цень самога сябе, на беднага айца Станіслава. Маім вачам прадстала адзінокая кволая чалавечая постаць у па-бальнічнаму белай вопратцы. Не запраўленая кашуля зверху і знізу расшпілена, і з-пад яе рэдкімі касмыкамі тырчаць сівыя валасы. Станіслаў выглядае як дзікая не дадраная птушка, і я адчуваю сябе паляўнічым, які праз імгненне даб'е нямоглае стварэнне.

«Падымайся, — нечакана для сябе кажу строга. — Прабач, я не хацеў так рэзка».

«Ты мая мілая істота», — выпырхнула з вуснаў Станіслава, ён паслухмяна падымаецца.

Дастаю з торбы ксяндзовую вопратку. Станіслаў сарамліва адварочваецца да сцяны, выставіўшы да

мяне вострыя лапаткі, накідвае на кволыя плечы чорную кашулю. Айцец Пятрусь кранае мяне за локаць: просіць адвярнуцца. Мы з біскупам загароджваем Станіслава ад чужых вачэй. Ён ужо накідвае сутану. Няшчасны адзінокі недалюблены чалавек…

«Хлопча, — шэпча мне на вуха біскуп, — завязі яго дахаты і пабудзь. Баюся, у адзіноце ён накладзе на сябе рукі».

«А такое са святарамі адбываецца?»

«Занадта часта».

«Як жа ты даедзеш да касцёла?»

«На таксі».

Праз колькі хвілін, калі я пераклаў з нашай машыны біскупскую вопратку для набажэнства і мы з айцом Петрусём развіталіся, я павёз свайго новага падапечнага дадому.

Жыве ён у звычайным савецкім раёнчыку ў дзевяціпавярхоўцы, пад якой параскіданы школка, садок з незлічонымі дзіцячымі пляцоўкамі, дробныя занядбаныя крамы. А паміж усёй гэтай старадаўняй грамадскай індустрыі панаторкнуты зялёнымі аблачынкамі таполі «часоў ачакаўскіх і пакарэння Крыма». Нават старэйшыя за пакарэнне Крыма.

Мы едзем у запляваным ліфце на апошні дзявяты паверх. Знянацку спыніліся, дзверы не адчыніліся, святло згасла. Ліфт засеў. Двое нас і двое нашых выяў у разбітым цёмным люстэрку. Набіраю МНС.

«Сець не ловіць», — адкладаю тэлефон у кішэню.

Мой адбітак у люстэрку абапёрся спінай аб сцяну, другі вобраз — Станіслава — шэрым прывідам

стаіць перад мной, трымаючы мяне за локаць, як гэта робяць людзі, якія прагнуць пяшчоты, але баяцца прытуліцца.

«Ды абхапі ўжо мяне», — кажу я.

«Чаму ты крычыш?»

«Ды таму, што ты баішся мяне, як і астатнія святары і нават я сам!»

Станіслаў набраўся смеласці і ласкава абхоплівае мяне:

«Упершыню за столькі гадоў пасля смерці Кандруся я адчуваю сябе жывым».

«Ты ведаеш, што ў гэтай кашулі, у якой ты цяпер, памёр Кандрусь?»

Вочы ксяндза палезлі на лоб.

«Ну хоць штосьці ад яго», — горка ўсміхаецца святар.

Маё сэрца растае салёнымі слязамі.

«Зміцеру, ты плачаш?»

«Я зламаю шыю Міхалу за тое, што ён назваў цябе шэрай плесняй!»

На хвіліну я пашкадаваў, што сказаў так: гэты моцны грубы выраз мог напужаць вытанчанага айца Станіслава. Але яго рэакцыя здзівіла мяне: ён убірае у грудзі паветра і ўрачыста-захаплёна прамаўляе:

«Зрабі так!»

Мы глядзім адзін аднаму ў вочы. Святло ўключылася, ліфт паехаў вышэй.

Наш паверх. Выходзім на смуродную праз смеццеправод лесвічную пляцоўку.

«Шкада, што святло ўключылі. Я б яшчэ з табой пастаяў», — сумуе айцец Станіслаў.

«Біскуп прасіў мяне пабыць з табой».

«Чаго?» — палохаецца святар.

Я апускаю вочы:

«Каб ты не самазабіўся», — мне няёмка так гаварыць.

Станіслаў абрадаваўся:

«Сапраўды? Цудоўна!» — утыкае ключы ў шчыліну, уваходзім унутр.

Цяпер я зразумеў, што айцец Станіслаў не такі просты, якім падаецца.

Ён першым мяне пускае ў змрочную кватэру. Мае боты прыліплі да падлогі. Я запаліў святло. Што ж… рамонту гадоў столькі ж, колькі і самой кватэры. Сонечнае святло прабіваецца скрозь цёмныя фіранкі і залатым променем разганяе срэбраны пыл у паветры. Тут чатыры пакоі, але бачна, што Станіслаў карыстаецца толькі кухняй і спальняй — ліпкая сцежка на лінолеуме яднае толькі гэтыя два памяшканні. У астатніх трох пакоях, наколькі вока бачыць з калідора, занадта акуратна, хоць мэбля пакрыта дываном шэрага пылу.

«Нешта ты падзапусціў свой дом», — я не падумаў, што гэта груба прагучала.

Станіслаў не зняў ботаў, праходзіць у спальню. Я таксама пайшоў за ім у абутку.

«Ты можаш ісці. Абяцаю, я не зраблю сабе шкоды», — святар сядае на не засланы ложак.

«Прабач, я не хацеў быць грубым».

«Што? Ах, не. Я не пра гэта… Я ж табе непатрэбны».

«Цяпер патрэбны…» — сумна ўздыхнуў я.

І нешта забыўся, што Станіслаў старэйшы за мяне ў разы два.

Святар зняў сутану. Без яе ён выглядае зусім танклява: чорныя порткі сцягвае рамень, у якім нефабрычна прабітыя дзіркі падраліся праз частае выкарыстанне. З чорнага каўняра кашулі асляпляльна белым колерам свеціць святарская каларатка.

«Ты можаш пакінуць Кандрусёву вопратку сабе. Не думаю, што біскуп будзе супраць», — сказаў я.

«Баішся яе насіць?»

Я спахапіўся, бо гэта праўда:

«Ёсць такое, але біскуп кажа, што яна мне пасуе».

«Добра, пакіну. На памяць пра Кандруся, біскупа і цябе», — сумна-ласкава ўсміхнуўся Станіслаў, накінуўшы сутану назад на кволыя плечы.

Ён так і плюхнуўся на ложак, захінуўся коўдрай. Адвярнуўся да сцяны. Мае вочы прыкмецілі гітару ў куту. Савецкую, ссохлую, напэўна, малапрыдатную, але гітару.

«Можна сыграць?»

«Грай».

Бяру інструмент, настройваю, нарэшце б’ю пальцамі па струнах:

«Што такое восень — гэта неба,
Плача сумна неба пад нагамі.
Ў лужынах злятаюцца птушкі чарадамі,
Восень, я даўно не быў з табой».

«Гэта ты сам пераклаў?» — паварочваецца Станіслаў.

«Так. Табе падабаецца?»

«Агась, — Станіслаў сядае, — але рыфма кульгае. Давай яшчэ».

І я разануў струнамі пальцы:

«І ёсць чым плаціць, ды я не хачу
Перамогі любой цаной.
Я не хачу нечыя грудзі таптаць нагой,
Я хацеў бы застацца з табой, — я глядзеў прама ў вочы Станіслава, пакуль спяваў гэты радок. —
Проста застацца з табой,
Ды высокая зорка у небе заклікае ісці».

Занураны святарскі твар заружавеў:

«А далей?»

«Група крыві — на рукаве,
Мой парадкавы нумар — на рукаве,
Пажадай мне удачы ў вайне, пажадай мне:
Не застацца ў гэтай траве.
Пажадай мне удачы!»

Ксёндз весела загігікаў:

«Малайчына, Гільятэн!»

Тут забрынкаў мой тэлефон. Падымаю трубку — біскуп:

«Змітро, як вы?»

Па голасе біскупа мне стала зразумела, што нешта здарылася.

«Цудоўна. У нас тут канцэрт. А што, праблемы?»

«Са мной хочуць сур'ёзна паразмаўляць біскупы і айцец Міхал. Яны патрабуюць, каб ты хутка прыехаў».

«Хутка прыеду».

Хаваю ў кішэню тэлефон, паварочваюся да Станіслава:

«Мне трэба ў касцёл».

Айцец захваляваўся:

«А Міхалу што патрэбна?»

«Не ведаю, а што?»

«Ён да гэтага часу слугуе КДБ!»

Гэта здзівіла мяне, але на ўсялякі выпадак перапытваюся:

«Ты сапраўды ўпэўнены ў гэтым?»

«Я еду з табой. Па дарозе растлумачу».



Дзея 2
Царкоўнікі

Мы селі ў машыну. Сур’ёзны Станіслаў пачынае аповед:

«Будынак КДБ не здарма названы самым высокім у Мінску: з яго было бачна жыццё кожнага беларуса ад межаў і да межаў БССР. Тут было струшчана нямала чалавечых лёсаў за доўгія гады панавання сацыялізму. Разведка не абышла і майго сябра пяцідзясятніцкага пастара Саву. Яго арыштавалі за тое, што ў яго хаце збіраліся хрысціяне.

Падчас аднаго з хатніх набажэнстваў Сава адчуў моцную думку, што людзей трэба як мага хутчэй адпусціць. Вернікі спрытна рассыпаліся па вуліцы, бо ўжо пад’язджалі варанкі. Сава заўсёды здагадваўся, што пасярод паствы ёсць стаўленік разведкі, які паведамляе пра жыццё вернікаў куды належыць. Пастар спакойна адчыніў дзверы тром узброеным хлопцам, стаў у дзвярны праём, жорстка ўчапіўшыся рукамі ў вушакі. З братам Савам доўга не цырымоніліся: выбілі пастара з праёму і кінуліся на пошукі хрысціян. Упусцілі! Усе вернікі паўцякалі! Усе… акрамя аднаго. І ўзброеныя асілкі развярнуліся да пастара Савы, які дагэтуль ляжаў на спіне. Ён быў задаволены тым, што аніводная авечка з яго паствы не пацярпела. Далей ён слаба памятаў, што было. Яго дужа пабілі, кінулі ў варанок, прывезлі ў Мінск у КДБ. Дапытвалі. Катавалі. Ізноў дапытвалі. Моцна білі, трымалі ў падвале, не давалі пітва і ежы, ізноў

білі. Сава не ведаў, калі пачынаецца ранак ці вечар. Яму было ўжо абыякава: увесь вольны ад допытаў час ён паўсвядомы ляжаў на падлозе. Пастар нават не ведаў, колькі часу прайшло з таго дня, калі ён апынуўся тут, у КДБ.

Так было да таго дня, пакуль два хлопцы не паднялі яго з падвала і пацягнулі ў кабінет нейкага важнага супрацоўніка з зорным небам на пагонах. Але цікавіў яго на гэты раз не пастар Сава: з гэтым штундыстам і так было зразумела, што не адмовіцца ад сваёй веры.

Хутка на парозе з’явіліся два ксяндзы. Першым стаяў айцец Міхал, за ім — ягоны юны сябра айцец Станіслаў. Гэта я.

Я быў тады танклявы, уражлівы хлопец, і жахнуўся падранага цела пад нагамі. Супрацоўнік, які прывёў нас, абыякава пераступіў праз пастара Саву. Айцец Міхал жвава пераскочыў праз пакутніка, а я, ціхі і чуллівы да чужой бяды хлопчык, палахліва глядзеў на параненага чалавека.

„Славіку, давай пераступі“, — загадваў айцец Міхал, што баяўся за наш лёс, бо мы лёгка маглі апынуцца скрываўленымі на падлозе побач з гэтым няшчасным.

Мае вочы напоўніліся слязамі:

„Гэта ж чалавек…“

„Это сектант!“ — умяшаўся супрацоўнік з сузор’ем на пагонах.

„Гэта чалавек!“ — пісклявым праз слёзы голасам даводзіў я.

Я бачыў, як Міхал гутарыў з разведчыкам, даючы прысягу даносіць на каталікоў, калі даведаецца нешта „няўгоднага“ падчас іхніх споведзяў. Падпісваў здрадніцкія паперы… Супрацоўнік пакуль не чапаў юнага мяне. Ён быў упэўнены, што выгляд замучанага чалавека напужае ранімага хлопца і я зраблю ўсё, каб не апынуцца на месцы пастара Савы. Але жах, атрыманы пасля сустрэчы са збітым пратэстантам, стварыў на мяне адваротнае ўражанне. Я зразумеў: калі зараз пераступлю праз гэтага чалавека і падпішу тыя страшэзныя дакументы, пасля споведзяў мне дзясяткі людзей будуць гатак сама ляжаць пад нагамі, як гэты пратэстант.

Ізноў адчыняюцца дзверы. Увайшоў праваслаўны святар айцец Кастусь. Ён быў моцна складзены чалавек з густой барадой. Пастар Сава намагаўся закрыць твар рукой: праваслаўныя святары ненавідзяць пратэстантаў. Кастусь можа і нагой на твар наступіць — так думаў Сава. Але ён не пацэліў у думкі Кастуся: святарскае сэрца затрымцела, убачыўшы параненага чалавека.

„Это штундист!“, — працягваў правакаваць супрацоўнік.

„Калі Хрыстос блудніцу не асудзіў, дык чаму я павінны караць гэтага няшчаснага?“ — Кастусь падаў пастару руку.

Нашымі з Кастусём намаганнямі ўсадзілі Саву на падлогу. Вочы разведчыка зыркалі з-пад густых броваў на бацюшку:

„Думаю, вы не собираетесь сотрудничать с нами, как это делают ваши друзья-попы?“

„Нізавошта“, — Кастусь пільна ўзіраўся ў супрацоўніка.

„Не созрели ещё“, — адвёў вочы разведчык.

Яго позірк апусціўся на спалоханага мяне, а я падтрымліваў пастара Саву. Мякка абхапіўшы рукамі параненае цела, я ўжо не задумваўся пра тое, каб пайсці супраць Бога, падаўшы руку гэтым забойцам у пагонах.

„Покачтоотпущувас,—прабубніўсупрацоўнік,— но когда придём за вами в следующий раз, будем говорить по-другому. И заберите с собой этого сектанта!“

Мы з Кастусём узялі пад рукі нямоглага Саву. На выхадзе з будынка я згадаў, што пакутніку патрэбна паліто, але айцец Кастусь падумаў пра гэта на імгненне спрытней за мяне і накінуў сваю куртку на Саву.

„Вам трэба ў бальніцу“, — сказаў я пастару.

„Мне трэба дадому. Я жыву ў вёсцы. Прашу, адвядзіце мяне на вакзал“, — ён ледзь дыхаў: зламаныя рэбры ўпіраліся ў лёгкія. Апусціўшы шэры твар з карычневымі плямамі вакол вачэй, ён глытаў свежае паветра без пылу.

„У вас засталася сям’я?“ — спытаў айцец Кастусь.

„Мая жонка з’ехала ад мяне, забраўшы пяцярых дзяцей“.

„Бо вы — сектанцкі пастар? — раптам секануў Кастусь і тут жа сам адчуў брыдоту ад сваіх слоў: — Даруйце, калі ласка“.

Пастар засмуціўся:

„Яна таксама пяцідзясятніца… КДБ ніколі не давала нам спакою“.

„У вас засталася жывёла ў вёсцы?“ — ізноў спытаў я.

„Лепш… — збітае пастарскае аблічча засвяцілася шчырай усмешкай, Сава зрабіў жэст, і мы схіліліся: — Я схаваў у дрывотні дзясятак новых Біблій. Хвалююся за іх, каб дождж не прамачыў. Магу падзяліцца“.

Раптам шчырыя блакітныя вочы Савы ўпалі на айца Міхала — таго самага ксяндза, што здрадзіў, падпісаўшы страшныя паперы. Ён стаяў на адлегласці і чакаў мяне. Міхал не мог глядзець у вочы пастара, праз якога пераступіў: моўчкі апусціў позірк. На шчасце, ён нічога не пачуў пра Біблії. Я махнуў рукой былому сябру:

„Я не магу пайсці з табой. Мне трэба дапамагчы гэтаму чалавеку“.

Тады Міхал пакінуў нас і пайшоў. Я павярнуўся да Савы:

„Калі вы не хочаце класціся ў бальніцу, прапаноўваю пабыць у мяне: вас адпускаць аднаго ў вёску ў такім становішчы нельга“.

Мы з Кастусём узялі пастара пад рукі, пайшлі да аўтобуснага прыпынку. Хутка былі ў мяне дома.

Я быў вельмі рад прымаць гасцей у сябе на кватэры. Даверыў параненага пастара айцу Кастусю, а сам пайшоў гатаваць ежу. Святар дапамог Саву прывесці сябе ў парадак. Пакуль айцец Кастусь

спрытна рэзаў бінты, пастар стараўся пазбягаць яго позірку з-пад густых сівых броваў. Кастусь здагадваўся, чаму гэты чалавек бараніў рукамі твар ад яго.

„Няўжо вы думалі, што я наступлю на вас?“ — асцярожна пытаецца Кастусь.

„Вы ж нас ненавідзіце, — ціха адказвае пастар і дадае: — Я так думаў раней“.

Айцец Кастусь уздыхае:

„Я нядаўна прасіў Бога мець братоў-хрысціянаў, якія ніколі не здрадзяць Яму“.

А я, пачуўшы гэту размову, сам сабе разважаў, што пасля страты Міхала, які здрадзіў, я застаўся адзін. Мабыць, гэтыя два чалавекі, што справай даказалі веру, стануць мне сябрамі?

„Вам трэба аддаць Бібліі. Мы абавязаны навучыць людзей любові“, — пастар Сава ўсміхнуўся».

Усміхаецца і айцец Станіслаў, думаючы пра старых сяброў.

Акт 3

ЗДРАДА ВЕРЫ

«Вера без дзеяў мёртвая»

Якава 2:20

Дзея 1
Пагоня

Мы са Станіславам прыехалі ў канцы набажэнства.

Я складаю літургічнае адзенне біскупа ў пакет. Не знаходжу стулы. У маім сэрцы пахаладзела.

«Хлопча, што здарылася?» — занепакоіўся біскуп.

Я ліхаманкава пераглядаю рэчы.

«Яе няма!»

«Каго?»

«Стулы».

«Яе і не было».

«Ты служыў без стулы?»

«У любым выпадку, гэта не надта важна».

«А калі адміністрацыя… то бок, іншыя святары ўбачылі?»

«Бог — Адзіны наш Начальнік».

«А парафія?»

«Забудзь! Ды калі і заўважылі, хіба важна чалавечае меркаванне? Важна быць у Божых белых адзеннях».

Айцец пяшчотна схіліў сівую галаву мне на грудзі, абхапіўшы мае худыя бакі.

Але айцец Міхал прыкмячае адсутнасць на біскупе стулы. Ён падыходзіць да нас з астатнімі ксяндзамі, як яны, цалуе біскупу пярсцёнак, але робіць гэта з адмысловай меланхалічнай элегантнасцю, быццам стары пан заляцаецца да дзяўчынкі. Біскупу нецікава стаяць і прымаць

віншаванні ад людзей, якія яго не любяць. Толькі тым ён шчыра ўсміхаецца, хто ласкава падыходзіць да яго ў пошуках супакою. А я чакаю, калі гэта цырыманіяльная экзекуцыя скончыцца. А Міхал па-братэрску кладзе руку біскупу на плячо і цяжка ўздыхае, заплюшчыўшы вочы:

«Войча, ваш юны сябар забыў стулу».

«Гэта я яе не ўзяў», — прыкрывае мяне мой лагодны старац.

Міхал выпучыў вочы, быццам яго стукнулі нажом у спіну.

«Як?.. А парадак?»

Ягоны хітры твар падобны да морды воўка, якога хочацца стукнць. Я пачынаю злавацца на Міхала:

«Біскуп не лялька, якую трэба прыгожа апранаць, каб ён міла ўсміхаўся і прасоўваў беларускую мову ў масы. Ён Божы раб! І што Госпад скажа яму рабіць, тое ён і будзе рабіць, і ўсялякія пыхлівыя царкоўнікі яму не ўказ!».

Апанент адсунуўся, глянуў мяне, як экзарцыст на д’ябла:

«Ты — блюзнер, які піша пра нас дрэнныя творы! — абураецца ксёндз. — У цябе толькі нядаўна пух на шчоках прабіўся, а ты ўжо нас лаеш!»

Размову перарываюць два біскупы — тыя самыя, якія дакаралі мяне пасля таго, як я застаўся з Алесем у касцёле. Цяпер яны паблажліва ўсміхаюцца, і я бачу, што майму айцу гэта не даспадобы.

«Войча, — ліслівa азваў майго старца першы біскуп, што з маршчынкай на лбе, — даўно мы вас не бачылі ў касцёле».

«Старасць і здароўе, што сказаць, — падтрымлівае таварыша другі біскуп, з рабым носам. — Мы жадаем убачыць вас за нашым сціплым сталом».

Не чакаючы адказу майго айца, яны адпіхваюць мяне ад майго старца, падбіраюць яго пад рукі і цягнуць.

Нас праводзяць цёмнымі калідорамі ў малы пакойчык: спачатку праходзяць біскупы, за імі я, а за мной шыбуе мой наглядчык Міхал — сівы ксёндз з воўчым поглядам.

«Цыгарэты ў руках, чай на стале…» — мой недарэчны спеў выклікае ўсмешку ў майго біскупа і шаленства ў жоўтых воўчых вачах Міхала, што пільна глядзяць мне ў спіну.

Я хацеў дапамагчы свайму айцу сесці на крэсла за стол, але рабы біскуп нядбайна адціснуў мяне і сам сеў побач з маім старцам, аддзяліўшы мяне ад майго настаўніка. Другі біскуп, што з маршчынамі на лбе, не сядае: ён важна абапёрся аб дубовы стол, вакол якога завіхаецца з імбрыкам спагадлівы Міхал. Ён клапаціцца пра гэтых біскупаў, што, як сівыя авечкі, паблажліва паглядаюць на ўслужлівага свайго раба. Я хацеў быў шапнуць тое-сёе свайму айцу, ды паміж намі сядзіць рабы біскуп.

Прамоўца з маршчыністым лбом пачынае трывалую казань:

«Наш мілы айцец Пятрусь! Мы вельмі рады, што ты адгукнуўся на нашу просьбу папіць гарбату з намі, — прамоўца фальшыва ўсміхаецца. — І хаця

мы любім юнага Змітра, якога ты ў такім нясталым узросце пасвяціў у святары, мы не можам вызнаць яго за сапраўднага прэсвітара. Мы не пярэчылі табе ў тваім нерацыянальным выбары з павагі да тваіх біскупскіх рызаў. Але ты сам бачыш, якія непрыгожыя творы ён піша пра наш касцёл».

Я падавіўся гарбатай, айцы недарэчна зірнулі на мяне. Толькі мой старац глядзіць у стол, абапёршыся шчакой аб правіцу.

«Але мы цэнім твой выбар, — працягвае ілжывую прамову маршчыністы біскуп. — Таму просім цябе паслухаць нашу думку. Ты ўжо стары і не так добра спраўляешся…» — ён запнуўся, бо не ведаў, як граматна вывернуць рэпліку.

Ён бездапаможна глянуў на другога, рабога біскупа, што раздзяліў нас. Рабы пераганяе гарбату са шчок у глытку, дапамагае таварышу выкруціцца:

«…не так добра спраўляешся са сваімі абавязкамі, як нам хацелася б».

Першы маршчыністы біскуп кіўком аддзячыў рабога і працягвае:

«Не, таксьці ты нядрэнны служыцель. Зусім нядрэнны… — рабы біскуп і Міхал сутаргава заківалі, а гэны кажа: — Проста ты, войча, узяў у памагатыя чалавека, які ненавідзіць нас і касцёл. Не ведаем: ці былі ў Змітра гэныя блюзнерныя думкі да знаёмства з табой, ці гэтыя яго разважанні — плод тваіх разважанняў, неакуратна ўкладзеных

табой яму ў дурнаватую маладую галаву. У любым выпадку, ты любіш чалавека, якога не любім мы, і ты пакрываеш ягоныя юнацкія выбрыкі».

Мой біскуп сядзіць агаломшаны. Рабы, што сядзіць паміж намі, дадае:

«Чаму ж ты трымаеш Змітра ля сябе, калі ёсць кандыдаты вартыя тваёй, войча, увагі. Напрыклад, айцец Міхал», — паказвае на сівога ксяндза.

Міхал... шэры, шыракаплечы, статны, з інтэлігентнымі разумнымі вачыма.

«Характар нардычны, — заключыў я. — Бязлітасны да ворагаў касцёла. Сапраўдны езуіт!»

Айцец Пятрусь ва ўвесь голас засмяяўся, а біскупы з Міхалам непрыемна на мяне паглядзелі.

«І што вы хочаце? — выцірае слёзы смеху старац. — Выгнаць з касцёла майго Змітра?»

«У вашым узросце патрэбны намеснік», — павоўчы злы Міхал цяжка глядзіць на мяне,

«І што, новы намеснік — вы?»

«У вашым адказе я адчуваю незаслужаную агіду да сябе. А я хацеў бы быць вам памочнікам».

«Шаноўны ксёнджа, мне не патрэбны яшчэ адзін памочнік».

«Вам патрэбны яшчэ адзін памочнік!» — упіраецца маршчыністы.

«Вы павінны згадзіцца добраахвотна», — падтрымлівае рабы.

А Міхал крывадушна-ласкава сціскае лапатку майго біскупа, наўмысна абуджаючы страшныя ўспаміны Петруся.

«Махале, пусці», — просіць мой старац, і Міхал, хоць неахвотна, але адпускае.

Біскуп ліхаманкава дрыжыць, і я бачу, што зараз ён зломіцца… Памятаю гарачую скруху, якую ён адчуваў, калі распавядаў, як яго ў маладосці гвалцілі манахі ў кляштары.

Я ўзняўся. Мой мозг наліўся крывёй. Мой агаломшаны погляд скіраваны ў чэрап Міхала, і бяльмо свядомасці малюе раскрамсаную ягоную галаву. Бачу: прысутныя аслупянелі, спалоханымі куранятамі глядзяць на мяне, каршака. Кідаюся на Міхала. Гэты дужы чалавек уцякае ад кволага мяне, чарвяка. Мінаем дзверы, лавы, абразы, бяжым на вуліцу. Ён выварочвае да Свята-Духава сабора, бяжыць уніз па лесвіцы да Свіслачы, ляціць уздоўж яе.

Ён ведае: не ўцячэ. Стамляецца, запавольвае. Я каршаком даганяю. Не адчуваю болю, толькі жалезны прысмак крыві ў роце. Даганю. Даганю і заб’ю. Нага знясілена падвярнулася, і я падаю ніцма. Не магу паварушыцца. Напэўна, паміраю.

Нарэшце мой занепакоены біскуп торкнуў у спіну:

«Хлопча, падымайся. Няма чаго ляжаць на асфальце».

Аднекуль з’яўляюцца сілы: ускакваю і нямоглы падаю ўніз. Біскуп дапамагае ўзгрэбсціся на ногі і выстаяць, адцягвае пад вярбу на траву.

«Дзе Міхал?» — нямогла шапчу я, стараючыся не запэцкаць крывёй белую вопратку майго Петруся.

«Не ведаю, пэўна, ужо ў саборы. Я гнаўся за вамі і сустрэў яго, калі той вяртаўся. Гэта ён мне сказаў, што ты паваліўся».

«А дзе астатнія біскупы? Няўжо яны кінулі свайго паслугача Міхала, каб я яго забіў?»

«Напэўна, таксама ў саборы. Яны не беглі са мной», — біскуп глядзіць спалохана-любоўна, і я толькі цяпер заўважаю, як ён хвалюецца.

«Як жа я хацеў бы памерці вось так, тут, у тваіх святых руках!»

«Ты, паэта, павесіў на вярбу сваю арфу», — біскуп сумна ўсміхаецца.

«Мая царква, на якую я паклаў уласнае жыццё, не прымае мяне і маіх твораў. Але ж я праўду напісаў! Якія ж яны святары, калі так абыходзяцца са мной і з табой? І кажуць, што Богу служаць, а мы з табой нібыта не служым. Гэта трагедыя майго жыцця!»

«Яны баяцца», — заключыў біскуп.

«Нас з табой баяцца і думаюць, што я — вар’ят».

Біскуп туліць мяне да сваіх грудзей, я адчуваю, што ляжу на мяккай гарачай падушцы ягонага цела, і святы айцец любіць мяне.

Ён усміхаецца, звычайныя простыя, шэрыя, ды цяпер нябёсна-блакітныя вочы зззяюць:

«Няхай вусны яго мяне пацалуюць! Бо лепшыя за віно твае ласкі».

«Гэта Песня песень!»

Таямніча біскуп паглядае на мяне, адкрывае кішэнную Біблію, чытае:

«Радавацца і весяліцца будзем з табою; — больш за віно будзем славіць пяшчоты, цябе годнасна любяць!»

«Ты прызнаешся ў каханні! — смяюся. — Песня песень у цябе самая чытэльная кніга з усяго Старога Запавета: тут найбольш сцёртыя старонкі!»

«Гэта Біблія належала Кандрусю. Памятаю, любілі сядзець увечары за сталом, па чарзе адкрывалі Пісанне і чыталі ўслых, як мы робім цяпер з табой. Кандрусь заўсёды чытаў толькі адну Песню песень, таму я яе на памяць вывучыў. А чытаў ён строга, без адцення на пачуццё. А маё сэрца гарэла… Аднаго дня я папрасіў яго пачытаць штосьці яшчэ. І што ты думаеш ён адкрыў? Псалом сорак чатыры! — біскуп гартае Псалтыр, чытае: — „Песня кахання. Маё сэрца вылілася добрым словам, я кажу: песня мая пра Цара, язык мой — пяро хуткага пісьма. Ты прыгажэйшы за сыноў чалавечых, мілата з Тваіх вуснаў вылілася, таму дабраславіў Цябе Бог навечна“».

«Слухай, — непакоюся я, — а з Кандрусём адбываліся падобныя хваляванні, як цяпер с мной?»

Біскуп працягла ўздыхае:

«Занадта часта, каб я мог прывыкнуць».

«І ўсе таксама баяліся яго, як і мяне?»

«Нават ты яго пабойваўся».

«Як і сябе».

«Як сябе».

«Цяпер я адчуваю, што люблю яго, хаця ён ужо спачыў».

Біскуп ззяе:

«А я кахаю цябе, як кахаю яго!»

Дзея 2
Айцы

Я, айцец Пятрусь і айцец Станіслаў сядзім у тым самым пакоі, дзе мы размаўлялі з біскупамі.

«Кандрусь таксама любіў сядзець са мной гэтак», — спакойна смяецца біскуп.

Я рад, што ўчынак Міхала не пакінуў адбітку на ягоным настроі.

«Ведаю, — шчабеча Станіслаў, — ён расказваў мне».

«Толькі любоў магла перамагчы ўсё тое, што адбылося з намі ў юнацтве.

Гэта была Заходняя Беларусь саракавых гадоў. Даўно адгрымела Першая сусветная вайна, былі складзены бела-чырвона-белыя сцягі, якія ўзняліся над Беларускай Народнай Рэспублікай, каб знікнуць на дзясяткі гадоў да канца дваццатага стагоддзя. Прайшла хваля сталінскіх рэпрэсій і Другая сусветная вайна. І ўсе гэтыя гістарычная падзеі дужа змянілі жыццё двух каталіцкіх манахаў Язэпа і Вінцэся, якія паклалі свае жыцці за нашае з Кандрусём і Алесем выхаванне.

Тады мне было гадоў дзесяць. Я, Вінцэсь і Язэп вярталіся на калёсах з вёскі, дзе набылі тое-сёе для кляштара. Пагода абяцала быць добрай да вечара. Язэп спрытна спраўляўся з лейцамі, а я ехаў у яго на каленях. Наш сябра Вінцэсь стаяў на калёсах, сціскаючы стрэльбу: рэвалюцыі і войны прывучылі яго пільна аглядаць мясцовасць і сачыць, калі на шляху з’явяцца небяспечныя людзі, што гатовы

пазбавіць кляштара ежы. І няважна, пад якім штандарам з’явяцца яны: пад чырвоным, белым, бела-чырвона-белым, польскім, расійскім, нямецкім, савецкім — Вінцэсь усё роўна будзе стаяць да апошняга ўздыху. Праўда, ён зусім не ўмеў страляць, ды і мы з Язэпам не ўяўлялі, што ён, святар, змог бы падняць руку на жывога чалавека. Тым больш, што яго рукі дрыжалі.

„Сядай, Вінцэсю. На імшы настаішся“, — сказаў Язэп.

Вінцэсь сеў. Ён быў ладна складзены святар з павольнымі рухамі. Начытаны, бо менавіта прага да вучобы і прывяла сялянскага хлопчыка ў кляштар. Ён ніколі не казаў мне, ці пайшоў бы ў манахі пасля таго, з чым ён сутыкнуўся тут, у кляштары. Але пра што ён ніколі не шкадаваў, дык гэта пра сяброўства з айцом Язэпам.

Іканапісец Язэп не мог пахваліцца знешнасцю. Дакладней, мог раней. Ён прыйшоў у манастыр з палымянымі вачыма, прагнучы Божага Слова і Боскай мудрасці, але жудасная кампанія тутэйшых мніхаў з частымі папойкамі зрабілі сваю справу і ладны танклявы хлопчык ператварыўся ў рана пасівелага мужчыну з жухлым жоўтым тварам праз хворую печань.

„Уяўляю, што будзе, калі настаяцель убачыць нас без самагону“, — уздыхаў Язэп.

„Нічога не будзе, — адказваў спакойны Вінцэсь, — ну паб’юць разок, ну й што? Яны, п’яныя, яшчэ больш нас адлупцавалі б“.

Язэп уздыхнуў:

„Як усё гэта безнадзейна! Братку, яны ж рана ці

позна пазабіваюць нас. Яны ж нап’юцца, потым нас з табой, цвярозых, хапаюць і гвалтам напойваюць! І самае цікавае, што ніколі не ведаеш, калі яны за табой прыйдуць і калі і куды табе хавацца ці ўцякаць. Хоць ты ў манастыры не жыві!“

Ціхія вочы Вінцэся прасвятлелі, асянёныя светлай думкай:

„Не… Не! Мы аніяк не можам уцячы! Да нас жа прыходзяць людзі за падтрымкай. Хто, калі не мы?“

Язэп матае галавой:

„Табе лёгка казаць. Ты здаровы і калі б захацеў, мог бы харчавацца толькі адной гарэлкай і табе хоць бы што! А мая печань такой экзекуцыі не пражыве. Пасля гэтай распусты я доўга хварэю…“

Язэп мякка прытуліўся да пляча Вінцэся, які заўсёды перажываў за сябра і за царкву.

Нарэшце мы ўехалі ў браму кляштара. Нас сустрэў настаяцель — нізенькі стары чалавек са з’едлівымі маленькімі вочкамі:

„Вы спазніліся на імшу!“ — ён хрыпеў.

„А вы чаму не там?“ — буркнуў Язэп, распрагаючы мула.

„А самагон дзе?!“

„Нельга манахам выпіваць“, — спакойна адказаў Вінцэсь, узяўшы торбы з калёс.

Вусны настаяцеля затрымцелі, кулакі сціснуліся, вочы загарэліся дзікім агнём. Ягоны кулак пацэліў у худую Вінцэсеву шчаку. З-пад прамога носа пацёк чырвоны струмень. Лагодны святар глядзеў зверху ўніз на крыўдзіцеля. Нічога не адказваючы, Вінцэсь разам з Язэпам пацягнуў торбы на кухню. Я пабег

за імі. Язэп моўчкі шыбаваў за сябрам, спачувальна паглядаючы на шырокую спіну, на якой ужо ў гэту ноч прыбавіцца ран. Вінцэсь кінуў торбы на лаву і паваліўся на калені:

„Божа, спалі гэну Садому!“ — закрычаў святар.

Ён хацеў быў казаць яшчэ і яшчэ, але, раз’юшаны, не змог падабраць словы. Мы рэдка бачылі Вінцэся такім. Мне раней падавалася, што ён занадта абыякавы да гэтага ўсяго, але цяпер я ўбачыў, які ўнутраны боль кіпіць у сэрцы майго любімага святара.

Мы выйшлі на двор разгружаць калёсы. Вінцэсь заўважыў, што каля брамы стаіць маладая жанчына з двайнятамі-немаўлятамі. Яе нядаўна выгналі бацькі з хаты за нагуляных дзяцей. Жанчына была няўпэўнена: зайсці альбо яе, такую, пагоняць? Вінцэсь ветліва махнуў ёй, і маці зайшла на двор.

„Калі ласка, ці не можаце вы пасядзець з маімі сынамі, а я ў горад з’езджу? Той, што маленькі, — Алесь. Ён старэйшы. Ягонага браціка зваць Кандрусь“.

Вінцэсь панёс дзяцей да Язэпа. Той цікаўна выцягнуўся, углядаючыся ў постаць сябра, які бераўліва нёс двайнят. Ён радасна схапіў Кандруся, і немаўляці засмяялася, пакуль Вінцэсь пяшчотна калыхаў другога, як мы думалі, хлопчыка:

„А хто ў нас тут такі маленькі ў кляштары? Алесь у нас у кляштары! Ксяндзом будзеш!“

І Язэп усміхаўся, назіраючы за шчаслівым сябрам, які ласкава прыгарнуў сваё дзіця да грудзей:

„Вінцэсю, ты створаны быць бацькам!“

Манахі чакалі маці некалькі гадзін, але жанчына не вярнулася.

„Яна іх нам назаўжды пакінула“, — зразумеў Вінцэсь.

Што рабіць з дзецьмі? Мы вырашылі спачатку пакарміць і памяняць пялюшкі.

Вінцэсь расчыніў дзверы ў нашу каморку, упусціўшы праменьчык святла на цёмную гнілую падлогу. У пакоі стаялі дзве ссунутыя разам лавы, накрытыя старой коўдрай; стаяў куфар з той-сёй вопраткай, пісьмовы стол з шуфлядамі, закіданы кнігамі і накідамі абразоў, кніжная шафа.

„Гэта кепска, — заключыў Язэп. — Трэба прыбрацца“.

Таму Вінцэсь узяўся мыць падлогу. Язэп пакінуў немаўлят на лаве пад маю адказнасць, а сам пайшоў варыць кашу.

Прыйшоў раз’юшаны настаяцель: яму ўжо сказалі, што ягоныя нелюбімыя манахі сталі бацькамі.

„І што вы думаеце з імі рабіць?!“ — крычаў настаяцель.

„Самі вырасцім. Куды ж іх яшчэ?“ — вазіўся з анучай Вінцэсь.

„Якога яны полу?“

„Хлопцы“.

„Калі так, рабіце як ведаеце. Вырасціце сабе паслушнікаў, калі зможаце“, — настаяцель пайшоў.

„Мы вырасцім паслушнікаў настаяцелю, каб яму было каго гвалціць“, — сказаў дзесяцігадовы я.

Вінцэся перасмыкнула.

Язэп вярнуўся з кашай. Даў мне ежу, а сам разам з Вінцэсем узяўся карміць малых. Галодныя ружовыя дзеткі ледзь з лыжкай не з'елі тую кашу. Нарэшце манахі перадалі малых мне і змаглі паесці самі.

Пасля вячэры трэба было зрабіць апошняе: перапавіць немаўлят. Язэп узяў Кандруся, Вінцэсь — Алеся.

„Язэпе, — хвалюецца Вінцэсь, — гэта катастрофа! Гэта не Алесь, а Алеся!"

Мы ўтрох пераглядаемся не ведаючы, што рабіць.

„Маці схлусіла. Спалохалася, што не вазьму дзяўчынку", — уздыхнуў Вінцэсь, замотваючы ў чыстае Алесю.

„Што цяпер?" — непакоіцца Язэп.

Абодва манахі сядзяць побач на лаве. Язэп калыша Кандруся. Вінцэсь з мілатой пазірае на дзяўчынку, якая заплюшчыла сінія вочкі, заснуўшы пад ласкавы стук сэрца. Язэп пракручваў у галаве варыянты дзеянняў:

„Мабыць, яе ў жаночы манастыр?"

„Што ты! — шыкнуў Вінцэсь. — Каб яны яе, сіротку, мучылі гэтак сама, як нас?!"

„…ці вясковым аддаць", — разважае Язэп.

„Няўжо ты думаеш, што вясковыя больш літасцівыя за манахаў?" — забурчаў сябра.

Вінцэсь лёг на лаву, пяшчотна паклаўшы дзіця на грудзі. Язэпава сэрца растае:

„Мяркую, ты ўжо вырашыў пакінуць яе. Я згодны з табой, — раптам твар манаха перакошваецца, — але што будзе, калі яны зробяць з ёй тое, што чыняць з намі?“

Вінцэся перасмыкнула другі раз, ксёндз збянтэжана зірнуў на сябра. Ён добра разумее, што Язэп меў на ўвазе пад словам „тое“ — не пабоі і не папойкі, а горшае за гэта, ганебнае, чым заўсёды заканчваюцца злачынныя манастырскія гулянкі. Вінцэсь пра гэты сорам нават з Язэпам амаль не размаўлялі, асабліва пры мне.

„Калі яны нас не шкадуюць, што зробяць з дзяўчынай?“ — раз’юшыўся Язэп.

Напалоханы Вінцэсь шчыльней прыціснуў Алесю да сябе:

„Слухай, Язэпе, — вочы Вінцэся прасвятлелі, — а няхай наша Алеся будзе Алесем“.

Язэп прыўзняўся:

„Толькі тады і нам між сабой трэ называць яе ў мужчынскім родзе, каб ніхто выпадкова не даведаўся“.

Мы ўлягліся на лаве: манахі паклалі дзетак разам, Вінцэсь лёг з краю, а я — каля сцяны, прытуліўся да Язэпавай спіны.

Вочы Язэпа заплюшчыліся, а Вінцэсь змагаўся са сном, прыслухоўваўся да крокаў у калідоры. Але цяжкая паездка змарыла і яго, і ксёндз у дрымоце прытуліўся шчакой да галавы сябра.

Унізе нешта зашумела, і Вінцэсь уцяміў, што гэта да нас дуць... Але было позна ўцякаць: нязваныя госці ўжо зусім пад дзвярыма. Вінцэсь штурхануў Язэпа, і збянтэжаны сябар падскочыў.

„Хавайцеся ў куфар, а я іх сустрэну“, — скамандаваў Вінцэсь.

Язэп перадаў мне немаўлят і хацеў усадзіць нас у куфар, ды п’янае мніства ўварвалася ў каморку і ледзь не збіла з ног Вінцэся, што кінуўся затрымаць іх. Манахі не далі сказаць ксяндзу ні слова і кінуліся на Язэпа. Але я паспеў схаваць немаўлят у куфар. Нас утрох пацягнулі ў касцёл. Вінцэсь падхапіў мяне на рукі, каб вар’яцкі натоўп не затаптаў.

Баляй кіраваў п’яны настаяцель. Гэты хітры чалавек абмежаваў Язэпа і Вінцэся ва ўсім: даў непрыстасаваную для жыцця каморку, цкаваў і прымушаў астатніх здзекавацца з нас, ні ў чым невінаватых людзей.

„Ну што, Вінцэсю, думаў, што ў мяне гарэлкі ў загажніку няма? А вунь, паглядзі! На ўвесь кляштар хопіць і вам гэтак сама!“

Вінцэсь стараўся вырвацца з моцных мужчынскіх рук, уратаваць нас з Язэпам. Левай Вінцэсь прыціскаў мяне да грудзей, не даючы выдраць мяне, кволага хлопчыка, гэтым п’яніцам, а правай манах адбіваўся ад гэтых самых п’яніц. А няшчаснага Язэпа, які застаўся без абароны, манахі амаль адразу схапілі за горла і залілі гарэлкі. Раз’юшанага Вінцэся ўжо прыціснулі да падлогі пяцёра, спрабуючы заліць у яго гарэлку гэтак жа, як і ў ягонага сябра. Адзінае, што аддзяляла мяне ад іх — шырокія грудзі майго мілага айца, які ўсёй вагай свайго цела прыціснуў мяне да падлогі і трымаў над мной абарону, не даючы п’яным манахам выхапіць мяне з-пад яго.

А яго білі: нагамі, рукамі, кулакамі, бутэлькамі, сыпала шкло, рэжучы ягоную скуру. Адзін асілак здагадаўся перакруціць белую каларатку Вінцэся васьмёркай, душачы няшчаснага айца.

З’явіўся п’яны настаяцель з бутэлькай:

„Вось як трэ паству ўлагоджваць!“

І разбіў бутэльку аб галаву Вінцэся, і гарэлка змяшалася са святарскай крывёй. Другім ударам шкляного адбітка ўспароў горла ксяндзу. Жыццё пакідала Вінцэся разам з яскравай чырвонай крывёй, якая хлыстала фантанам з-пад рассечанай скуры. Задаволены настаяцель сеў задам прама на галаву Вінцэся і не спяшаючыся расшпільваў усе трыццаць тры гузікі сутаны паўмёртвага святара. Я сядзеў побач і не мог варухнуцца праз жалезны пах крыві. На дзясятым гузіку настаяцель стаміўся завіхацца з сутанай Вінцэся і дзвюма спрытнымі рухамі разадраў чорную скрываўленую тканіну. Што далей было — не ведаю дакладна, бо падышоў Язэп: ён скарыстаўся засяроджанасцю астатніх манахаў на хлебе і відовішчы, учыненым настаяцелем над паўжывым Вінцэсем, схапіў мяне і ўцёк. Апошняе, што я запомніў з гэтай карціны — Вінцэся, па целе яго прайшлося некалькі хваль агоніі… у яго і дагэтуль часта дрыжалі рукі і ногі, але не так. Затым слаўны наш айцец выдыхнуў. І ўсё. Памёр.

Мы з Язэпам цяжка паднімаліся да каморкі. Асабліва складана было ісці яму. Але хрыплы плач з куфэрка значна ацвярозіў нас і набавіў нам моцы. Знясілены Язэп адразу паваліўся на лаву, пакуль я браў бедных немаўлят на рукі.

„Пятро, — застагнаў Язэп, — дзе стрэльба?“

Я не паказаў яму. Тады ён сам падняўся, знайшоў зброю. Сеў на лаву побач са мной, уставіў дула сабе ў рот.

„Давай нас спачатку“, — спалохана азваўся я, шчыльней прыціскаючы да хлапечых грудак малых Алеся і Кандруся.

Язэп з жахам глянуў на нас. Няшчасны святар спалохаўся і выкінуў стрэльбу.

Клопат пра нас будзе надаваць сэнс ягонаму жыццю яшчэ гадоў пятнаццаць, пакуль падлетак Кандрусь не знайшоў да смерці згвалчанага Язэпа. З таго часу Кандрусь замкнуўся, стаў жорсткім, хоць раней любіў спаць на грудзях Язэпа і быў ціхай і прастадушнай авечкай».

Дзея 3
Бітва на Нямізе

Біскуп скончыў аповед. Я ўзяў слова:

«Цяпер добра разумею, чаму Алесь і Кандрусь так стаялі адзін за аднаго, калі Міхал выхапіў у мяне тэлефон і пачаў праглядаць тое, што я чытаў у сеціве. Кандрусь патрабаваў вярнуць, але Міхал грэбліва хіснуў яго ў грудзі. Унутры Алеся, які стаяў побач, штосьці здарылася: ён стукнуў Міхала кулаком у зубы. Міхал адказаў мацнейшым ударам — праз імгненне непрытомны Алесь ляжаў на падлозе. Я схіліўся да яго, закрываючы сабой ад бруднага Міхалава бота, што навіс над галавой настаяцеля. Кандрусь схапіў крыўдзіцеля, але не стукнуў яго. Міхал і без Кандрусёвага кулака самлеў: Алесеў удар быў моцны. Тут ачнуўся сам айцец Алесь і мы ўтрох асцярожна дапамаглі ачуцца Міхалу».

Біскуп сумна ўсміхаецца:

«Алесь... Алеся, хаця й дзяўчынка, увесь кляштар трымала ў жаху. Нас з Кандрусём абараняла».

Айцец Станіслаў заззяў:

«Вы ўтрох заўсёды былі добрымі са мной, асабліва мяне любіў Кандрусь. Памятаю, як я спаў на вакзале. Улёгся на падлозе, бо на крэслах не засталося месца. Мінакі чаплялі мяне нагамі, таму мая сутана ператварылася ў запэцканую анучу. Знянацку з’явіўся айцец Кандрусь. Я тады не быў з ім знаёмы асабіста, ведаў толькі па фота ў прэсе.

Гэтага чорнага ксяндза было цяжка не заўважыць. Вочы Кандруся глядзелі на мяне.

Я спалохаўся, што ён, убачыўшы ксяндза на падлозе, пакарае мяне за дыскрэдытацыю касцёла. Кандрусь падышоў да мяне, сеў на кукішкі, нервова сціснуў худую сваю пясць правай рукой з пярсцёнкам. На імгненне глянуў мне ў вочы, затым перавёў позірк на падлогу. Я зразумеў, што ён не збіраецца мяне караць. Знянацку нейкі пасажыр наступіў мне на руку. Айцец узняўся:

„Вы папіраеце нагамі святыню!“

Пасажыр шарахнуўся ад нас і паспяшаў на цягнік. Кандрусь перавёў любасны погляд на мяне. Я пачуў яго лёгкае дыханне і мілосныя вочы. Сухія вусны ператварыліся ў невыразную ўсмешку, і было бачна, што айцец не прывык усміхацца.

„Пайшлі“, — ён ціха падняўся.

Я ўскочыў, паваліўся, спатыкнуўшыся аб мокрую сваю сутану. Біскупскі намеснік пацягнуўся пальцамі да гузікаў, агаліўшы ссохлыя праз узрост пясці. Скінуў сутану, якая хавала кволую, счэзлую гадамі постаць, і выгляд яе ўнушаў бы жаль, калі б не гэтая строгая святарская выпрастка айца Кандруся.

Я палюбіў яго.

„Знімай!“ — строга паказаў пальцам на маю сутану.

Я паслухаўся. Айцец накінуў сваю сутану мне на плечы. Я адчуў цеплыню, пакінутую Кандрусём на сухой вопратцы, і гарачыню сухіх святарскіх рук на плячах.

„Чым не біскупскі намеснік“, — Кандрусь усміхнуўся.

Я ніколі не бачыў на фотаздымках, каб гэты чалавек усміхаўся. Айцец Кандрусь узяў чамаданы:

„Цягнік“.

Я паплёўся за ім. Раптам прыпаў да грудзей Кандруся, узняў галаву, правёўшы шчакой па шурпатай святарскай шыі, і лагодна зазірнуў вачыма ў вочы намесніка. Кандрусь зняў акуляры, сціснуў вуснамі чорную бліскучую дужку.

„Што ты хочаш?“

Я цяпер убачыў, што Кандрусь праз свой адказны характар не можа пакінуць мяне аднаго. Таму я адказаў:

„Прагну застацца з табой назаўжды“.

Тады ён абхапіў сціплую маю постаць, пастаяў крышачку ды пайшоў на цягнік. Я паплёўся следам, імкнучыся быццам ненаўмысна дакрануцца плячом да ягонага пляча.

Намеснік матнуў галавой, запрашаючы мяне ўбок. Знайшлі вольныя месцы ў вагоне, селі. Я замілавана зазіраў у вочы Кандрусю.

Мы сядзелі моўчкі. Сябар беражліва мяў мой шырокі святарскі пояс. Я заплюшчыў вочы, паклаў галаву на святарскае плячо. Кандрусь не выглядаў як чалавек, які любіць людзей. Але мая прысутнасць не толькі яго не засмучвала, нават наадварот: ён бязмерна любіў мяне. Сапраўды, я захацеў застацца з ім назаўжды».

Станіслаў патануў у мяккіх ўспамінах, губляючыся ў часе і прасторы.

На хвілінку мне захацелася падарыць гэтаму няшчаснаму ксяндзу імгненні любові. Я ціхенька ўзяў яго сухі локаць. На шчацэ Славы з’явілася празрыстая сляза. Біскуп паклаў святару на плячо мяккую гарачую далонь:

«Думаю, ты будзеш цудоўным маім намеснікам».

Я ўздыхнуў:

«Айцец Кандрусь ніколі не падаваўся мне добрым святаром. Ён быў строгім, загадкавым, сам сабе на розуме, нікога акрамя цябе, біскупе, не слухаў. Лічыў, што не павінны раіцца з іншымі святарамі. Патрабаваў ад нас многае, а з сябе — яшчэ больш, бо лічыў, што калі можа ён, тады і ўсе астатнія змогуць. А я не мог. Не мог быць такім, як ён. Строгім, правільным і пры гэтым — любімым».

Біскуп плача:

«Не дадаў я табе ласкі. Ты ж адзін у мяне, зусім без сям'і і сяброў, якія б цябе прыласкалі».

Я запяваю:

«Хто вінаваты, давядзе
Пра шчасце, што не існуе.
І перамога зло нясе,
Бо за удачай сум ідзе.
Чыя віна, што ты адзін,
Пражыў жыццё так да сівізн.
Яно адно, а ты жывеш
І спадзяешся, што памрэш.
Святло згарае, ціхнуць гукі,
І новай мукі прагнуць рукі.
Калі пакута суціхае,
Значыць, будзе новая бяда».

Знянацку дзверы ў пакой выбілі. На парозе ксёндз Міхал і некалькі людзей з КДБ.

«Біскуп патрэбны нам жывым і адносна здаровым. А Зміцер са Станіславам нам не патрэбны ні ў якім выглядзе. Гэта шэрая плесня любіць часаць языком

пра тое, што я сапраўдны здраднік, які зблытаўся з вамі. А Змітра вы самі ведаеце — змагар! Змагар, які хоча хапнуць біскупскую пасаду. Абяцаю вам: калі я займу месца айца Петруся, зраблю тое, што вы скажаце».

«Мы и половины не поняли, что вы сказали на колхозном, но сделаем то, что вы просили. При условии, что ваше обещание будет выполнено», — адказваў супрацоўнік.

Нас з айцом Станіславам схапілі, пацягнулі з сабора. Біскуп не пакінуў нас, ідзе следам.

Барвовае сонца захаду ператварыла Свіслач у кроў. Чырвоная вада павольна становіцца чорнай праз начное неба, бо сонца заходзіць, пакуль мы ідзём да ракі. Чорныя рукі крутанулі мне шыю да хрусту. Я са зламанай спінай лячу ў Свіслач. За мной — Станіслаў, хапае маю каларатку і цягне на паверхню. Яго сілы канчаюцца, святар упарціцца смерці, ляціць угору, да паверхні, змагаючыся за нашыя жыцці. Глыток паветра, свабода, хачу выгукнуць «ура». Цяжкі бот стукнуў Станіслава і выбіў прытомнасць з яго, знішчыўшы нашу надзею застацца ў жывых. Мы гінем у чорнай вадзе ў крывавы чырвона-чорны вечар, як гэта было да нас і будзе пасля нас.

Нарэшце зверху падаюць руку. Ведаю: я павінны пацалаваць яе. Яшчэ ведаю, што ў гэтай руцэ — хлеб. Яна і ёсць той самы хлеб. Яна схапіла мяне, цягне вышэй і вышэй, далей з гэтай вады, ад скрываўленага сонца, далей і далей.

Як будзе біскуп без мяне?

У яго ёсць Хрыстос.

КРЫЖ

Пастар Кірыл зранку ўглядаецца ў шыбу, ці няма на ледзяным полі фрыцаў. Пакуль нікога не заўважыў, хаця ведае, што яны тут ёсць: бачыў учора, як нямецкая каска перасекла снежную прастору і знікла ў лесе. Ходзяць. Разведваюць, ці няма ў вёсцы рускіх салдатаў. Але іх няма і быць не можа: свае ж вяскоўцы паўцякалі, як прыйшло паведамленне з суседняга сяла пра набліжэнне немцаў. Толькі пастар Кірыл са сваім сынам Васілём застаўся.

Кажучы пра гэтых дваіх, немагчыма не звярнуць увагу, што стары пастар Кірыл — удавец ад самае маладосці і ўласных дзяцей ніколі не меў. Ён ахвотна прыгрэў на грудзях сірату Васіля, калі хлопчык застаўся без бацькоў. Зараз яму пятнаццаць гадоў, і падлетак вельмі любіць новага бацьку. Кірыл яго ніколі не крыўдзіць, не б’е, словам павучае, калі Васіль нешта наробіць. Але і гэта бывае нячаста. Больш за ўсё яны праводзяць час разам у ціхіх гутарках ці за працай. Пастар Кірыл — ганчар. Так атрымалася, што ён занадта стары і слабы для працы на полі, а Васіль — надта маленькі і худзенькі. Вось Кірыл і зарабляе на жыццё вырабам посуду і вучыць гэтаму майстэрству сына. А Васіль мякка назірае за бацькам, як ён мне гліну і сціпла павучае сына:

«Васілю, глядзі: Госпад — ганчар, мы ў Яго руках гліна. Каб атрымаўся карысны сасуд, трэба прайсці мноства выпрабаванняў…»

Навучае, калі ходзяць па лесе і пастар паказвае на птушку:

«Сынку, глядзі: вось птушка, якая прыгожа

спявае. Яна шэранькая, зусім непрыкметная, а вунь як Госпаду нашаму служыць. А певень як страшна крычыць, хаця пярэсты. Але і ён патрэбны Богу, бо ён будзіць нас, каб мы раней узяліся за працу…»

Вось так вучыць стары Кірыл Васіля. А хлопчык, прызнацца, толькі і любіць, што чуць ягоны голас і бачыць сівыя вочы.

І цяпер Васіль ляжыць на халоднай печы, чакае сябра сваёй душы. Нарэшце Кірыл кладзецца побач, падбіраючы кволага Васіля пад бок. Хлопчык уціскае твар у старэчыя грудзі і амаль адразу засынае. У галаве пастара мітусяцца розныя думкі. Па-першае: скончылася ежа. Па-другое: няма дроў, а пайсці ў лес Кірыл не можа праз немцаў. І апошняя думка выціскае астатнія. Нядаўна, калі вяскоўцы раз'язджаліся, нехта прапанаваў Кірылу і Васілю паехаць з імі. Кірыл адмовіўся: няхай ён застанецца ў царкве, гэта значыць, у сваёй хаце, бо яна і ёсць тутэйшая царква. Куды ж яму, старому? Калі Бог захоча забраць яго душу, Ён гэта зробіць усюды, нават немцы для гэтага не спатрэбяцца. Суседзі старога не адгаворвалі: усе ведаюць, што калі пастар Кірыл нешта надумаў, ён ад гэтага пад расстрэлам не адмовіцца. Вяскоўцы называюць гэта ўпартасцю. А далей здарылася тое, чаго не чакаў і сам пастар: Васіль таксама адмовіўся ўцякаць з вёскі. Не тое, каб Кірыл надта здзівіўся гэтаму, але быў не гатовы. Васіль так пужліва прыціснуўся да яго, як кураняці, і ніякія ўгаворы добрых суседзяў не змаглі пахіснуць хлапчуковага меркавання. А Кірыл зусім не ўпрошваў яго пакідаць родны дом:

Васіль свабодна здзейсніў свой выбар, застаўшыся з любімым бацькам. І пастар радаваўся, што не застанецца адзін.

Кірыл неяк па-новаму зірнуў на свайго гадаванца. Раней ён не звяртаў вялікай увагі да гэтай прывязанасці, але цяпер цвёрда бачыць, што Васіль расплачваецца, мабыць, сваім жыццём за яго. Дарослы ўжо.

Узяўшы ў жылістую далонь таненькую ручку з амаль празрыстай скурай, святарскае сэрца абпаліла пытанне: ці зрабіў ён, Кірыл, усё, што было ў яго сілах, каб зрабіць гэтага падлетка шчаслівым? Ён раскайваецца, што часам не звяртаў на яго ўвагі, якая вельмі патрэбна ў гэтым юным узросце.

Хлопчык прачынаецца. Сцягвае з сябе кажушок і старанна ўхутвае свайго пастара. Бацькава сэрца трымціць: вунь які добры падлетак. Не пакіне свайго старога без клопату. Але як толькі Васіль заснуў, схаваўшы нос пад коўдрай, Кірыл захутаў яго назад у кажушок. Абняў, каб хлопчык не прастудзіўся на сцюдзёнай печы.

Пастар ўглядаецца ў крыж, што вісіць на сцяне. Ці доўга ім абодвум засталося пакутаваць на гэтай зямлі?

З ганка далятае мітусня. Чуецца нямецкая мова. Гучна стукаюць у дзверы: патрабуюць адчыніць. Стары пастар прыціскае малога пад бачок, захутваецца ў коўдру. Можа, не заўважаць. Замок выломваюць. На парозе стаіць нямецкі афіцэр. Калючыя вочы падаюць на распяцце і гэты чалавек упершыню за некалькі месяцаў адчувае трымценне

ў хаце ворага. Ён прыкмячае постаць на печы. Жорстка, але з ніякаватасцю гукае. Пастар Кірыл паднімаецца. Шыбуе да немца.

«Хто вы?» — пытаецца афіцэр.

«Пастар», — апускае вочы Кірыл.

«А там хто?»

«Мой сын Васіль».

Афіцэр адчувае, што не можа падняць руку на святара:

«Аднаверцы, — заключае ён. — Ты можаш застацца са сваім сынам. У нас тут будзе штаб».

Гэта ўдарыла пастара ў самае сэрца. Сівыя бровы насунуліся на блеклыя вочы праз пачуццё, якое ягоныя суседзі называюць упартасцю.

«Тут не будзе штаб, — строга адказвае пастар, — гэта царква, а вы — забойцы і жыць тут не будзеце».

Афіцэрскі твар памяняўся. У вачах з'явіўся нездаровы вар'яцкі агонь, уласцівы псіхічна неўраўнаважаным людзям. Калі б Кірыл не быў пастарам, яго б з Васілём тут жа размазалі па падлозе, але рэлігійныя пачуцці афіцэра перамаглі дзікунскую нянавісць.

«Пайшоў вон!» — выгукнуў нацыст.

Пастар патупаў да печы. Васіль назірае спалоханымі вочкамі за бацькам.

«Сынку, вазьмі нашу схаваную Біблію, а я пакуль зніму распяцце са сцяны».

Вялізны драўляны крыж і Біблія сталі адзінымі рэчамі, якія змаглі яны вынесці. Шыбуючы па зімовым полі ў суседнюю вёску, Кірыл неаднойчы думаў, што будзе, калі іх абодвух з крыжам і Бібліяй

заўважаць свае салдаты-камуністы. Будзе бяда, мабыць, яшчэ горшая, чым ад немцаў. І хаця змерзлыя старыя рукі патрабавалі адпачынку, пастар праз сваю ўпартасць адмаўляў сам сабе зняць са спіны крыж і кінуць яго тут, на полі.

Так яны ідуць, пакуль знясілены Васіль не падае на калені.

«Падымайся, тут недалёка», — падбадзёрвае бацька.

І толькі цяпер Кірыл разумее, што яны пайшлі не ў той бок і згубіліся. Пастар прымае рашэнне адпачыць да раніцы, а ўдзень, калі будзе светла, пашукаць якую-небудзь вёсачку. Каб ушчэнт не змерзнуць, пастар кладзе крыж, прыстройваецца на ім, каб хаця б не ўсё цела ляжала на голым снезе, а зверху на бацькавы грудзі прымасціўся Васіль з Бібліяй.

Сэрца Кірыла заўсёды трымцела, калі побач аказваўся ягоны ласкавы сын. Нават цяпер пастар адчувае ўнутраную цеплыню, а снег люстрам адбівае яркія промні святла маладзіка. А ці маладзік гэта? Няўжо ветах настолькі яскравы, што снег свеціцца такім белым і цёплым святлом і здольны сагрэць абодвух вандроўнікаў? Ці гэта ўжо дзень? Як бы там ні было, а пастару Кірылу ўжо не хочацца падымацца, не хоча злазіць з ягоных грудзей сын Васіль.

Развіднела. Адзін паляўнічы выйшаў на сваю справу. Ён выпадкова знайшоў у снезе два целы. Гэты чалавек пахаваў іх абодвух: бацьку і сына, — а крыж Кірыла паставіў над іхняй брацкай магілай.

ДЫЯРЫУШ

Запіс 1

Я прыехала ў кляштар. Хутка пачнецца манаскае жыццё, цікавае і складанае. Веру, што сёстры будуць рады мне, бо пакуль мой лёс складаецца не надта добра пасля таго, як памерла мама, пакінуўшы мяне з дзевяццю брацікамі і сястрычкамі. Я, старэйшая, старалася ўзяцца за вясковую гаспадарку, але ў мяне нічога не атрымлівалася. Бацька дужа лаяўся і біўся, кажучы, што я яму праклён, бо не ягоная дачка. Не ведаю, чаму ён так лічыць. Але хутка ён узяў жонку, якая не была ласкавейшай за яго, тады мне жыцця зусім не было і цяпер я тут.

У кляштары чакаю сустрэць Божых рабоў з палымянымі сэрцамі. Пакуль настаяцель не стварыў на мяне аніякага ўражання, гэты сухі чалавек з шырокімі вострымі плячыма, з якіх, быццам з вешалкі, сцякае чорная сутана. Падчас размовы ён павольна вадзіў нежывой рукой, нібыта ў рукаве хавалася не плоць і кроў, а металічныя тонкія трубы. І голас у яго як з чыгуну, і гэты голас брынчаў мне, што я малая і мне рана ў манахіні, але ўсвядоміўшы, што ісці мне больш няма куды, даў загад мяне прыняць.

Радасці маёй няма канца.

Запіс 2

Яны чамусьці ўсе сумныя, гэтыя манахі. Іхнія твары аднолькавыя, быццам яны тут усе цені. Мне далі вывучыць статут. Згодна яму, манахі і манахіні не могуць пераходзіць адзін да аднаго, мужчыны — на жаночую палову манастыра і наадварот без дазволу настаяцеля і асабліва ноччу. І яшчэ нельга выпіваць. Але сам настаяцель парушае гэтыя правілы! Я хаваюся ноччу пад ложак, каб не бачыць усяго таго, што робіцца ў пакоі.

Мае суседкі называюць мяне Святошай, а не Вікай альбо Вікторыяй. Сярод іх шмат маіх равесніц. І яны такія ж аднолькавыя паміж сабой як і іншыя манахі, і я ніяк не магу запомніць іхніх імёнаў. А яшчэ ў іх вострыя зубы і пазногці, і б’юцца дужа.

Запіс 3

Сёння да нас прыйшоў айцец Віктар — вельмі добры ксёндз гадоў пяцідзесяці. Ён ніколі не ўдзельнічае ў папойках і прыйшоў у наш пакой, бо ў аднаго з ложкаў надламалася ножка, і яго паклікалі адрамантаваць яе. Мяне дзяўчаты загналі пад суседні ложак і я баялася вылезці ў іхнія кіпцюры. Ведала, што айцец Віктар добры, але не думала, што ён заступіцца за мяне. Яго ўзрушыла тое, што мяне збіраліся пабіць: я пад ложкам пачула, як уздрыганулася яго постаць, і ён загадаў спыніць гвалт. Потым пяшчотна паклікаў мяне: «Вікторыя!» Я здзівілася, што мяне ўпершыню назвалі па імені. Але вылазіць пабаялася. Тады айцец Віктар намацаў маё плячо і сілай выцягнуў з-пад ложка. Ён адразу папрасіў прабачэння за гэта. Айцец Віктар сказаў мне, што калі мяне будуць крыўдзіць, каб прыходзіла да яго, і ён заступіцца за мяне. Але я вырашыла не турбаваць Віктара нават калі мяне будуць забіваць, бо тады дастанецца і яму.

Увечары сёстры называлі яго гнюснымі словамі за тое, што ён не застаўся з імі «на паболей». Яны не зламалі яго, Уломка — такая мянушка айца Віктара.

Запіс 4

З таго часу я пачала штодзень хадзіць да айца Віктара. Пераканаўшыся ў тым, што яго зневажаюць незаслужана, мне стала цікава, чаму яго настолькі не любяць. Я пайшла да настаяцеля.

Гэты сухі чалавек з вадкімі вачыма ссутуліўся над аркушам паперы, пішучы трактат. Я спытала яго, чаму мяне называюць Святошай, а айца Віктара — Уломкам, і чаму нас усе б'юць. Настаяцель загучаў чыгунным голасам, адказаў, што ў Віктара духоўнасць няправільная, зламаная, шчырая, непрадузятая. Тады я сказала настаяцелю, што ён ненавідзіць айца Віктара за дабрыню і літасць, бо сам злы. Настаяцель раз'юшыўся і выгнаў мяне.

У той дзень мяне хацелі пабіць сёстры (яны вырашылі, што я скарджуся настаяцелю на іх). Пагналіся, стукнулі, пацэлілі ў шчаку. Я на бягу павалілася. Але крыўдзіцелькі развярнуліся ўцякаць. Я падняла галаву: з касцёла бегам набліжалася чорная постаць. Віктар! Я настолькі ўзрадавалася, што забыла падняцца, а ён спужаўся за мяне, што ляжу, падняў. Я ўсё расказала, ён нахмурыўся, загадаў не хадзіць да настаяцеля з пытаннямі.

Тады я спытала, адкуль у яго на пераносі шныр. Віктар уздрыгануўся і адказаў, што звалiўся з лесвіцы.

Запіс 5

Я прывыкла, што ў кляштары надзвычай шмат размаўляюць і пры гэтым недагаворваюць. Мне падалося, што і айцец Віктар штосьці схаваў. І я пайшла разбірацца.

На шчасце, распытаць яго было нескладана. Здзейсніліся мае падазрэнні наконт таго, што Віктар не сам паваліўся, а яму памаглі. Потым і сёстры пацвердзілі, што бачылі, як настаяцель скінуў Віктара з лесвіцы, і ксёндз яшчэ доўга ляжаў на прыступках непрытомны.

Я раззлавалася і пайшла разбірацца да настаяцеля. А ён усё яшчэ пісаў свой трактат. Гнеўна глянуў на мяне, я выказала ўсё, што думаю пра яго. Тады ён ускочыў, узяў мяне за горла і пацягнуў да лесвіцы. Памятаю, як ён расціснуў жорсткую сухую далонь, калі я павісла над цёмнымі прыступкамі, адхіснуўшыся спінай у цёмную прорву. Памятаю, што ў галаве мільганула думка, што разаб’юся. Але я не ўпала. Дакладней, упала, але не на халодныя каменныя прыступкі, а ў рукі Віктара. Тады настаяцель пацэліў кулаком у твар Віктара, а ён і закрыцца рукамі не мог, бо трымаў мяне. Спінай паваліўся на лесвіцу, правай рукой прыціснуў мяне да сябе, а левай закрыў мой твар, і ўсе ўдары, пакуль мы ляцелі ўніз, прыйшліся на яго. Але боль не перашкодзіў яму падхапіць мяне на рукі і кінуцца на ўцёкі ад настаяцеля.

Мы схаваліся ў трапезнай. Маёй радасці не было межаў, бо айцец Віктар яшчэ раз уратаваў

мяне! А ён быў хмурны, строга глядзеў мне ў вочы. Спытаў, чаго я ізноў пайшла да настаяцеля. І тут я заплакала. Я зразумела, што прынесла Віктару шмат пакут сваімі хаджэннямі. Сказала, што люблю яго, і ўпершыню абхапіла Віктара. Ён спачатку разгубіўся, затым слёзы пацяклі з яго вачэй, і ён абняў мяне. Мы сядзелі і плакалі.

Запіс 6

Нядаўна айцец Віктар знайшоў мне прымяненне. Ён пісар і я часта дапамагаю з упарадкаваннем рукапісаў, бо ён захварэў на сухоты. А настаяцель вельмі ганарыцца сваім трактатам, але які сэнс ад пропаведзі, калі яна не падмацавана справай?

ТАМ, ЗА ДЗВЯРЫМА

Ангеліна стукнулася аб асфальт. Яна ведала, што адсюль трэба хутчэй сыходзіць, бо тыя-хто-трэба, якія днямі білі яе, могуць вярнуцца. Дзяўчына зрабіла намаганне падняцца, але рукі раз’ехаліся і яна ізноў павалілася. А чаму з яе здзекаваліся? Яна распаўсюджвае кнігі, якія камусьці перашкодзілі. Хрысціянскія кнігі.

Дзяўчына ўзграбаецца на млявыя ногі і рушыць наперад у цёмную ноч па глухіх вуліцах Мінска. Побач з катавальняй стаіць царква, куды калісьці хадзіла Ангеліна. Нават цяпер, збітая, яна туды не пойдзе па дапамогу — яе здалі ўласныя служыцелі. Хрысціянскія кнігі не спадабаліся.

Ангеліна прасоўваецца па пустой, без машын і людзей, плошчы Свабоды. Адзінокі аўтамабіль бліскае насустрач фарамі. У галаву дзяўчыне скокнула думка кінуць гэтае збітае, непатрэбнае цяпер ужо ёй самой цела пад колы. А навошта ёй жыць? Грошы скралі каты, таму ёй няма чым будзе заплаціць за здымную кватэру. Ангеліна здолела прагнаць гэту шалёную думку пра машыны і колы і пасунулася далей у цёмны завулак. Яна вырашыла, што ў яе калі і ёсць нешта каштоўнае, дык гэта душа. Глупа было б згнаіць яе пад шынамі праз кучку злых людзей.

Яна наткнулася на браму касцёла. Дзяўчына тут нікога не ведае. Няхай. Вунь гарыць святло ў акенцы — значыць, тут нехта застаўся пасля начной імшы. Ангеліна націснула локцем на ручку дзвярэй, каб не выпацкаць крывёй, што цячэ па далоні. Тут невялічкі пакой, а за ім — яшчэ адзін, дзе

гарыць святло. Ісці далей Ангеліна не наважылася. Што яна скажа таму, хто сядзіць там, за дзвярыма? Што трапіла ў катавальню і засталася без сродкаў да існавання? Дык гэта яе праблема... Урэшце, здала яе туды сама ж царква. Значыць, там ёй і месца. Стаяць цяжка, таму Ангеліна сядае на падлогу. Побач стаіць канапа, але яна не хоча заліць яе крывёй, а паркет выцерці прасцей.

Айцец Юзэф, паляк, пасунуўся на калідор з пакойчыку са святлом. Ён апошнюю гадзіну не хацеў выходзіць, бо чуў крокі ў касцёле, якія спыніліся за яго дзвярыма. Пэўна, ізноў тыя-хто-трэба. Хаваць яму няма чаго, і ён выходзіць. Уздрыгвае — промень святла з пакоя трапіў на бялок вока разбітай дзяўчыны. На імгненне айцец падумаў, што яна мёртвая, але Ангеліна варухнулася. У дзявочую, ахутаную туманам галаву, стукнула думка, што гэты служыцель такі ж, як і тыя, хто выдаў яе на згубу. Цела ўздрыганулася, Ангеліна пляснула нагамі аб падлогу, як б’е хвастом выкінутая на пясок рыба. Але ўцячы няма сіл. Валіцца. Айцец Юзэф усадзіў дзяўчыну на канапу.

«Што з вамі? Хто вас скатаваў?»

«Тыя-хто-трэба», — сплюнула крывавую сліну Ангеліна.

«Разумею. І за мной прыходзілі. І ніхто мне не дапамог, а здалі свае», — уздыхнуў ксёндз.

Ангеліна з палёгкай увабрала паветра: ёсць чалавек, які яе разумее.

«У якім класе вучыцеся?» — спытаў Юзэф.

«Ужо не ў якім».

«Няўжо вы дарослая? Спадзяюся, у вас ёсць сям’я? Муж, бацькі, сябры?»

«Я адна. Мне няма чым за здымную кватэру заплаціць».

Юзэф задумаўся.

«Са мной жыве мая пляменніца, крыху малодшая за вас. Вы можаце спыніцца ў нас».

«Я прынясу вам непрыемнасці».

«Не страшна».

Ксёндз апрануў яе ў сваё паліто і ўзяў на рукі. Ангеліна даўно забыла гэта неверагоднае пачуццё, калі бацька нясе цябе на руках. Дзяўчыне падаецца, што яна мусіць быць цяжкай. Але святар падняў яе лёгка, нягледзячы на сівы ўзрост. А несці было цяжка, ды данёс.

Жыве ён побач. Пляменніца напалохалася, калі ўбачыла Ангеліну, а айцец Юзэф сказаў:

«Цяпер у цябе ёсць сястра».

Уранку, калі пляменніца ўжо сышла ў школу, айцу патэлефанавалі з касцёла. Вельмі няўчас, бо Юзэф у гэты момант зайшоў у пакой Ангеліны і заўважыў, што яна застыла ў тым жа палажэнні, як ён пакінуў яе ўночы. Яшчэ не ўпэўнены, ці жыва яна, ксёндз падняў тэлефон:

«Прабач, не магу прыйсці… Ведаю, што падводжу… На гэты раз важная прычына…»

У трубцы на святара крычалі.

«Не, гэта не тое, што вы падумалі… — Юзэф не з тых, хто плача проста так, але цяпер яму хочацца пусціць слязу. — …Адну дзяўчыну пабілі, і яна ноччу прыйшла ў касцёл… Я ведаю, што

мой пастарскі абавязак быць на імшы, але важней дапамагчы чалавеку».

Трубку кінулі.

Позірк Юзэфа мякка апусціўся на сінія вочы Ангеліны, якія ціха глядзяць на ксяндза.

«Прабачце», — уздыхнула дзяўчына.

«Вы не вінаваты. Са мной заўсёды так размаўляюць. Што я магу зрабіць для вас?»

«Можаце падысці?»

Юзэф сеў побач.

«Я не хачу жыць…»

«Чаму?»

«Мяне здалі служыцелі за хрысціянскія кнігі, якія ім не спадабаліся. Каму я патрэбна, калі ад мяне адвярнулася царква?» — усхліпвае Ангеліна.

«Богу ты заўсёды патрэбна, а хто цябе здаў — тое не царква».

«А што такое царква? Гэта вы?»

«Хто цябе любіць».

ІСУС, СЫН НАВА

Аднаго Чалавека пасадзілі ў турму. Вязень спатыкнуўся аб парог і стукнуўся аб халодную падлогу. У вачах мільганулі цені — тое не ад удару, гэта сапраўдныя цені. Пацукі? Дзверы зачыніліся і Чалавек застаўся адзін… ва ўсякім разе, ён мяркуе, што застаўся адзін. Нясмела ступае да нараў. Стомлена кладзе галаву на вадкую падушку. У пер'і хруснула. Чалавек спахапіўся, дрыготкімі рукамі ўчапіўся ў коўдру. Глядзіць на падушку. Ізноў пацукі? Няўпэўнена цягне руку, сціскае навалочку — унутры хрусціць паперай. Чалавек знаходзіць дзірку, выцягвае непадатны жоўты скрутак — сшытак, перапісаны ад рукі, ужо мяккі, як тканіна. Уверсе падпісана: «Кніга Ісуса, сына Нава».

«Гэта нешта з Бібліі», — разважае Чалавек.

Разгортвае кнігу ў канцы, чытае:

«Гасподзь прагнаў ад нас усе народы і амарэяў, якія жылі ў гэтай зямлі. Таму і мы будзем служыць Госпаду, бо Ён — Бог наш».

Бог наш? Бог чый? Ізраіля? Вочы шукаюць на старонках, хто такія амарэі. І Чалавек вырашае прачытаць кнігу спачатку.

Прачытаўшы раздзел, Чалавек адкладае сшытак:

«Гэта занадта сумна, доўга і незразумела мне».

Ён хавае скрутак паперы пад падушку і кладзецца на ложак. У куту нешта шкрабецца — маленькі пацук умывае мордачку лапкамі. Чалавек ускрыкнуў. Пацучок цікаўна глянуў на новага суседа і працягнуў умывацца.

«Не, так я ад жаху звар’яцею», — думае Чалавек.

Ён ізноў бярэцца за кнігу, каб забыць пра пацукоў. Нарэшце вязень знаходзіць амарэяў на старонках кнігі. Гэта адзін з тых самых народаў, якіх Гасподзь аддаў на вынішчэнне Ізраілю, бо амарэі былі разбэшчанымі людзьмі, служылі чужым багам. Дачытаўшы, Чалавек ізноў кладзецца на ложак, заплюшчвае вочы.

«Напэўна, Бог і мяне аддаў на з’ядзенне пацукам за мае грахі. Нават гэтыя гідкія звяры апынуліся больш правымі перад Ім, чым я».

Толькі ён падумаў пра гэта, пад ложкам зашуршала. Чалавек ускочыў. З-пад ложка, са шчылін у сцяне — адусюль збіраюцца пацукі. Яны селі перад Чалавекам і ўсе як адзін цікаўна глядзяць вачыма-бісерам на вязня.

«Божа, яны мяне з’ядуць. Ізраіль змагаўся з такой вялікай колькасцю народаў і адольваў іх, і калі Ты сапраўды ёсць, Табе зусім нескладана выбавіць аднаго чалавечка ад пары дзясяткаў пацукоў. Нягледзячы нават на тое, што я зрабіў злачынства… даруй мне яго».

Пацукі паглядзелі на Чалавека і абыякава разбегліся па сваіх пацуковых справах. Вязень паваліўся на ложак: за гэту хвіліну ён праз страх страціў сілы больш, чым ад самай цяжкай працы. Млявыя вусны шапнулі «дзякуй…» перад тым, як Чалавек самлеў.

«Выходзьце!» — гукнуў наглядчык.

Аслабелы вязень ледзь падымаецца. Няўжо пасля

такога цяжкага здарэння яго пагоняць працаваць? Ён будзе мясіць нагамі бруд да канца свайго жыцця. А за акном свеціць вясновае сонейка! Праменьчык мякка кранаецца нагі Чалавека, быццам кліча на волю. Ах, калі б ён мог усё перайначыць, тады б не стаў учыняць тое, што рабіў раней. Чалавек чуе новую кроў у сваім сэрцы. Яго напаўняе дзіўная радасць, якая адсоўвае думку пра незайздросны свой лёс. Чалавеку здаецца, што яму далі крылы, і ён гатовы анёлам лунаць нават падчас цяжкай турэмнай працы. Хто ведае, можа Бог, Які захаваў яго ад пацукоў, злітуецца і цяпер? Чалавеку думаецца, што ён згодны застацца з Госпадам, абы не быць сябрам пацукам.

«Выходзьце! Ці вы збіраецеся застацца вязнем навечна?»

«Я ж ім застануся нават тады, калі вы прыведзяце мяне на вуліцу, паставіўшы пад вышкі».

«Якія вышкі? Вас апраўдалі!»

«Што?»

«Вас апраўдалі! Ідзіце хутчэй!»

Чалавек стаіць за турэмнымі дзвярыма. Цяпер ён можа пайсці і рабіць усё, што захоча, як гэта было раней. Навошта? Каб зноў апынуцца на нарах з пацукамі? Але ён пазнаёміўся з Жывым Богам! Ці не занадта глупая гэта смерць: адкінуць Божую ласку? Не, цяпер ён не будзе хадзіць крывымі сцежкамі, а пойдзе шляхам Божага народа. Чалавек успомніў, што забыў кнігу Ісуса, сына Нава пад падушкай. Напэўна, Госпад гэта папусціў для таго, каб наступны вязень таксама змог пазнаёміцца з Богам.

ЭВА ФАЎСТ

Акт 1

ЦАРКОЎНІЦЫ

Гэта гісторыя пачалася ў кабінеце пастара Фаўста. Да яго на размову прыйшла дзевятнаццацігадовая дзяўчына са складаным іменем Ксенафонція Пфляўмбаум, якую ў царкве ўсе называюць папросту Сеняй.

Пастар, сухі чалавек сярэдніх гадоў, нервова ўчапіўся ў нататнік жылістымі пальцамі.

«Сеня, — кажа пастар Фаўст, — я з табой абсалютна нязгодны! Што табе не падабаецца ў маёй царкве? Глядзі, які прыгожы будынак, якія сімпатычныя вернікі, цудоўныя набажэнствы…»

«У гэтым і справа, — кажа Сеня, — усё прыгожа і вытанчана, як з вокладкі глянцавага часопіса… А Духу Божага няма!»

«Як няма?! — жахаецца Фаўст. — Ты што, разумнейшая за нашых царкоўнаслужыцеляў і можаш нас крытыкаваць?»

Грукнулі дзверы. На парозе — Эва Фаўст, дачка пастара. Складная дзяўчына гадоў дзевятнаццаці, у штанах клёш, пінжаку з гальштукам, з непакрытай галавой і ў тоўстых акулярах, дакладна такіх жа, як у пастара Фаўста. Бацька жахнуўся адзенню сваёй дачкі.

«Эва, ты ж у царкве!»

«А што? Мне апрануць спадніцу па шчыкалаткі і разрэзам па сцёгны, як гэта ўпарта робіць твая любімка з царкоўнага хору?» — з’едліва ўсміхаецца Эва, увагнаўшы бацьку ў чырвань.

«Так, Эва, з табой мы пагаворым дома, — пастар выцірае пот са лба, — а зараз папрашу цябе сысці. У мяне споведзь!»

«Ды якая розніца: зараз яе пачую ці ты ўвечары мне споведзь разбалабоніш! — павярнулася да Сені: — Не бойся, Сеня. Я яму прыкрою рот, калі ён захоча нечым падзяліцца з твайго асабістага жыцця».

«Эва, чаго ты прыйшла?!» — злуецца бацька.

«Забраць падручнік па біялогіі. У нас тут дзяўчаткі лаюць сінтэтычную тэорыю эвалюцыі. Не тое, каб я сама была яе прыхільніцай, але я ненавіджу, калі людзі крытыкуюць тое, пра што нічога не ведаюць. Вось і пайду прасвятляць нашых спецаў».

«Не смей! — грукнуў бацька па стале. — У мяне і без цябе праблем навалам!»

Эва абаперлася вострымі локцямі аб бацькавы пісьмовы стол і абвяла тату праніцальна-з'едлівым позіркам. Пастар Фаўст не вытрымаў і апусціў вочы.

«Ты, здаецца, падручнік на паліцу паставіла».

«Ах, забыла. Вам у тэалагічным хаця б памяць развіваюць! — Эва ўзяла кнігу. — Сеня, пайшлі. Ты тут усё роўна праўды не даб’ешся. Я спрабавала».

Як толькі дзяўчаты сышлі, бедны пастар Фаўст знясілена паваліўся ў мяккую фатэль, падумаўшы, што Сеня кепска ўплывае на Эву.

Тым часам Эва цягне пад руку сяброўку Сеню. Хаця сябрамі іх назваць можна з вялікай нацяжкай. Апынуліся яны ў адной лодцы не па ўзаемнай згодзе, а па цяжкіх абставінах жыцця. Эва любіць параўноўваць іхнія адносіны з СССР

і Трэцім Рэйхам, калі гэтыя дзве краіны вырашылі супрацоўнічаць, аказаўшыся ізгоямі на палітычнай арэне.

«Эва, а ты верыш у Бога?» — нечакана пытаецца Сеня.

Эва натхнёна раздзьмула грудзі, падрыхтаваўшыся выкладаць сваю гіпотэзу:

«Ведаеш, Сеня, я ў адрозненне ад большасці нашых хрысціянаў не падзяляю сусвет на рэальны і духоўны. Я лічу, што ўсе духоўныя праявы — вынік дзеянняў пакуль невядомых нам законаў фізікі. Мне вельмі пасуюць гіпотэзы адносна мультысусветаў, мнагамернасці, чорных дыраў, кратовых нораў. Таксама цікавыя даследаванні ў вобласці квантавай фізікі і…»

«Дык а ў Хрыста ты верыш?»

«Не... ну... веру, канешне. Але я думаю, што мы таксама зможам стаць багамі, калі паглыбімся ў нашыя сусветныя законы».

Паўза. Эва, ужо без натхнення, працягвае прамову:

«Ведаеш, мой бацька таксама не ацаніў мае нестандартныя разважанні. Мне яшчэ за іх і прыляцела».

Дзяўчыны прыйшлі ў залу для набажэнстваў. Лавы адсунуты да сцен і замест іх усё памяшканне застаўлена столікамі. На сцэне ўсталяваны каляровыя пражэктары, як у цырку. Вернікі пакрысе падцягваюцца на канферэнцыю.

«Вы зарэгістраваныя?» — пытаецца дзяўчына са спісам.

«Эва Фаўст і Ксенафонція Пфляўмбаум», — адказвае Эва.

Дзяўчыны падыходзяць да століка з прыгажунямі.

«Значыць так, паненкі, — пачынае Эва. — Зараз я распавяду вам прынцыпы эвалюцыі, абапіраючыся на сучасныя даследаванні…»

Дзяўчаты кісла паглядзелі на юную навукоўцу: яны толькі што стралялі вочкамі ў тых маладых прапаведнічкаў, што за суседнім столікам, і стары Дарвін іх зусім не цікавіць.

«Ты з імі вядзеш навуковыя дыскусіі? — Сеня ціхенька кранула локаць Эвы. — Ім жа гэта абыякава!»

«Ты сама хоць у гэта верыш?» — буркнула Эве адна з дзяўчын.

Біёлаг абурыўся:

«Вераць толькі хрысціяне і крэацыяністы! Сапраўдны навуковец павінны не верыць, а дакладна ведаць, абапіраючыся, як я ўжо казала, на наву...»

«Гэта яна так набывае ўвагу хлопчыкаў», — хіхікнула другая прыгажуня і кампанія рассмяялася.

Эву быццам стукнулі па шчацэ:

«Вы… вы хаця б маеце мазгі, каб казаць такія рэчы? Я мела шчасце не кахаць!»

Сеня своечасова выхапіла цяжкую кнігу з рукі сяброўкі, інакш падручнік прыляцеў бы ў твар адной з дзяўчат. З кнігі вываліўся нейкі падмяты глянцавы аркуш. Сеня яго паднімае і бачыць сертыфікат на ўніверсітэцкую прэмію за дасягненні ў вобласці біялогіі. Яна мезенцам лічыць нулікі…

«Сеня, ты грошай ніколі не бачыла?» — папракнула Эва.

«Даруй, — спахапілася Сеня. — Я выпадкова».

Эва нядбайна суне сертыфікат назад у кнігу.

«Ты залатая ўніверсітэцкая моладзь? — Сеня акуратна пытаецца. — А я ж і не ведала…»

Эва стараецца схаваць ганарлівую ўсмешку.

Тутэйшы дырэктар тэалагічнага інстытута пан Грэм торкнуў у Сеніна плячо.

«Табе зараз трэба будзе выступаць», — вывучана ўсміхаецца мужчына з бабачкай на шыі.

Ён толькі пяць хвілін назад заўважыў у спісе ўдзельнікаў імя Ксенафонціі Пфляўмбаум, і не зразумеў, хто гэта:

«Гэта хто? Я не ведаю», — сказаў дырэктар памочніцы, якая адзначала ўдзельнікаў.

«Ды гэта ж Сеня».

«Ах, Сеня. Як я мог забыць! Такое складанае імя!» — і пан Грэм побач з «Ксенафонція Пфляўмбаум» аловачкам падпісаў «Сеня».

Сеня ступае за кафедру, прыціскаючы да сябе Біблію. Заклаўшы паміж старонкамі кнігі вялікія пальцы, неспакойна аглядае прысутных.

«Гэта яна ў мінулы раз сказала, што нам патрэбна пакаянне за нашыя грахі?» — чуецца з залы шэпт.

«Навошта нам пакаянне? Мы і без Бога святыя».

«А яшчэ яна кажа, што з Богам можна сябраваць».

«Святатацтва нейкае».

«Пэўна, вар’яцтва».

Сеня набірае паветра ў грудзі і, гледзячы паверх галоў у нейкую кропку ў сцяне, нямогла выдыхае:

«Што зрабіў я за агіднасць,

Я забойца і зладзей?
Я ўвесь свет прымусіў плакаць
З дарагой зямлі людзей».
Зала заціхла.

«Гэта ж „Нобелеўская прэмія“ — знакаміты верш Барыса Пастарнака!» — хваляй праносіцца гул па зале.

«Ты што, чытаў свецка-савецкія вершы?» — гучыць у адказ нечы голас.

«А ты хіба не?»

«Не чытаў, ды асуджаю!»

Пастар Фаўст дэманстратыўна падняўся з-за століка, дзе сядзяць біскуп’я, і пад маўклівыя позіркі залы ідзе за кафедру. Узяўшы Сеню за рукаў, пастар выводзіць дзяўчыну са сцэны. Каля дзвярэй пастар Фаўст гучна прамаўляе, каб усе пачулі (асабліва біскупы):

«Сеня, сёння мы далі табе шанец рэабілітаваць сваё імя, сказаўшы нам нешта добрае. А ты ізноў усё папсавала!»

Голас Сені дрыжыць:

«Ды што ж гэта за савеччына такая!»

Яе словы патанулі ў паветры маўклівай залы. Сеня выйшла за дзверы.

Эва выскачыла на сярэдзіну сцэны:

«Тата, ты ідыёт!» — і кінулася за сяброўкай.

«Гэта ваша дачка?» — пытаецца нехта з біскупаў у разбітага пастара Фаўста.

«Не, — адсякае пастар. — Мы з ёй нават не знаёмы».

Акт 2

ВЯЛІКАЕ ПЕРАСЯЛЕННЕ

Дзея 1

Сеня і Эва сядзяць у кавярні.

«Добра, што Пастарнака ўспомніла!» — падбадзёрвае Эва сваю сяброўку.

«Ты радуешся не волі Божай, а што Яго воля супала з тваімі ўласнымі меркаваннямі».

Эве непрыемна гэта чуць, але яна не прывыкла спрачацца з відавочнымі фактамі.

Паўза.

«Ведаеш, Сеня, — Эва сціскае жылістымі пальцамі падручнік па біялогіі, — я люблю цябе за тваю шчырасць. Але мне нашыя адносіны нагадваюць Трэці Рэйх і СССР, калі…» —

«Ты нападзеш на мяне?» — Сеня падняла вочы.

Эва збянтэжылася:

«Чаму я, а не ты?»

«У мяне не хапае мазгоў. Я — вар’ятка».

«А ў мяне сэрца. Я — душэўнахворая».

Ніякаватыя дзяўчыны пайшлі дадому да Эвы. Сеня сама да канца не разумее, чаму яна згадзілася на гэта. Напэўна таму, што калі яна застанецца адна, на яе нападуць цяжкія думкі.

Пакой Эвы Фаўст абсталяваны хаатычна. Адразу выдзяляецца пісьмовы стол, закіданы кнігамі, сшыткамі і важнымі навуковымі паперамі,

пасярэдзіне — камп'ютарны манітор. Ля стала стаіць крэсла на калёсіках, на якім асела палова Эвінага гардэроба. Ёсць таксама дзве шафы: адзежная і кніжная. У куту сціпла стаіць ложак. Эва ключом корпаецца ў ніжняй шуфлядзе пісьмовага стала. Сеня здзіўлена назірае, бо не разумее, што можна хаваць пад замком ва ўласным пакоі.

«Сеня, не хвалюйся, — усміхаецца Эва. — Я не куру, не п’ю і не калюся».

Фаўст нарэшце адчыніла шуфляду, поўную баначак энергетыкаў.

«Толькі бацьку не кажы, — Эва адкаркавала вялікім пальцам металічнае колца. — Тата забараняе іх піць».

Сеня не паспела нічога адказаць, як Эва, гэта танклявая дзяўчына, ураз уліла ў сябе ўсю банку.

«Эва, што ты! У цябе ж хворае сэрца!»

«А я без іх жыць не магу. Сплю на хаду, бо начамі сяджу за дакладамі і рэфератамі».

Біёлаг закінула пустую банку назад у шуфляду, пазбавіўшыся ад улікі. І якраз своечасова, бо ў кватэру ўваходзіць бацька. І не адзін: побач з ім ягоная любімая харыстка, якую Эва на дух не пераносіць.

Эва выходзіць на калідор, глядзіць на харыстку. Засмучаная поглядам дзяўчыны, спявачка бездапаможна паглядае на пастара Фаўста, ён негасцінна ўзіраецца на Сеню, а Сеня, у сваю чаргу, няёмка пераводзіць вочы на Эву.

«Мне час ісці», — кажа Сеня, збіраючыся выскачыць з кватэры, але Эва схапіла сяброўку за локаць і зацягнула ў свой пакой:

«Сядзі тут. Я пайшла разбірацца».

Пастар з харысткай ужо на кухні. Ён цвёрда і з выклікам мераецца жорсткасцю вачэй з дачкой.

«Эва, мы вырашылі ажаніцца».

«Я — пратэстант, і я пратэстую!»

«Ты мяне не зразумела: я не пытаюся ў цябе твайго непатрэбнага цяпер меркавання, а стаўлю перад фактам: мы ажэнімся».

«То бок у сэнсе, вы не ўлічваеце майго меркавання? У мяне тут прапіска! А дзе вы сваіх дзяцей трымаць будзеце? У нас два пакоі: адзін мой, другі твой. Атрымліваецца, сваіх дзіцянятаў вы сплавіце да мяне, так? Яны будуць біць мой камп'ютар, куплены на маю стыпендыю, і драць кніжкі, так?!»

Харыстцы і тут вельмі не шанцуе: яна адышла, не хочучы ўдзельнічаць у сямейным канфлікце, і якраз зазірнула ў суседні пакой. Які апынуўся, канешне, Эвіным.

«Вунь адсюль!» — юны біёлаг садрала паліто харысткі з вешалкі і кінула ў дзяўчыну.

Пастар Фаўст хапае дачку за каўнер.

«Што табе не падабаецца? — рыкае бацька. — Агуч свае ўмовы!»

Эва спакайнее:

«Мне не падабаецца, што я, страціўшы маці ў чатыры гады і пражыўшы ўсё жыццё да дзевятнаццаці выключна з табой, павінна буду падпарадкоўвацца дзяўчыне, якой… колькі табе гадоў?»

«Дваццаць два», — адказвае харыстка.

«…якая старэйшая за мяне толькі на тры гады».

«І гэта ўсё?» — павёў брывом бацька.

«Не ўсё. Ведаеш, я ў падручніках па заалогіі чытала, што альфа самцы імкнуцца набыць прыгожых таўста…бёдрых самак для здаровага маладняку і…»

Сухая жылістая рука б’е Эву па шчацэ. Яна спатыкаецца, але гэта ж рука не дае дзяўчыне паваліцца на падлогу. Бацька падхоплівае Эву, кідае дачку на яе ложак, ледзь не збіўшы з ног Сеню. Б’юць дзверы Эвінага пакоя. Дзяўчаты адны.

«Эва, як ты?» — Сеня кладзе руку на плячо сяброўкі.

Біёлаг сядае побач, папраўляючы акуляры. Яна глядзіць у сцяну тупым позіркам:

«…ён ніколі мяне не біў… Няўжо інстынкт размнажэння сапраўды мацнейшы за інстынкт захавання гэтага самага маладняку?..» —

«Эва, я магу нечым дапамагчы?» — мякка запытваецца Сеня.

«Можаш, — Эва ўрэшце прыходзіць у сябе. — І прабач, што табе прыйшлося гэта ўсё бачыць».

«Усё добра. Што я магу зрабіць?»

Эва цяжка ўздыхае:

«Дапамажы мне сабраць рэчы. Я патэлефаную сваёй выкладчыцы, якая здае аднапакаёўку».

І пакуль Сеня ляжыць пад пісьмовым сталом, разблытваючы камп'ютарныя правады, Эва тэлефануе выкладчыцы. Сеня чуе нацягнуты смех і жарты сяброўкі, але і гэта не можа схаваць усяго

таго перажытага болю. Чуецца, як на кухні радуюцца пастар Фаўст з харысткай: у іх смеху і ветлівых словах таксама чуецца напружанне, асабліва ў пастара.

«Цудоўна! — Эва кладзе тэлефон. — Я магу засяліцца зараз. Толькі трэ ва ўнівер заехаць да выкладчыцы: ключы забраць».

Эва пакінула Сеню адну ў пакоі.

Сеня некаторы час адчувала напружанне, думаючы, што яна скажа пастару, калі ён зойдзе ў пакой. Але пастар не зайшоў ні праз дзесяць, ні праз дваццаць хвілін, ні праз гадзіну, пакуль адсутнічала Эва. За гэты час Сеня паспела ўвязаць кнігі той вяроўкай, якую знайшла ў шафе Эвы, склала адзенне ў пакеты (якія знайшла там жа). На шчасце, рэчаў у Эвы не так многа, як гэта здавалася праз беспарадак.

Эва вярнулася задаволеная і з ключамі. Дзяўчыны пачалі выносіць рэчы ў машыну Эвы. Увесь гэты час пастар з харысткай не выходзілі з кухні. Эва пайшла на адчайны крок: трэба вынесці смецце і зайсці на кухню па маленькую патэльню — уласнасць Эвы, таксама купленую на яе стыпендыю. Дзяўчына ніяк не схавала пустыя банкі з-пад энергетыкаў, а проста так на бацькоўскіх вачах кінула ў сметніцу. Пастар Фаўст адзначыў сам сабе, што потым трэба будзе пагаварыць з дачкой і пра гэта. Бацька значна паспакайнеў і харыстка таксама не адчувае болей сябе чужой: яна ўзяла тую маленькую патэльнічку Эвы і нешта гатуе, весела гутарачы з жаніхом.

«Штосьці не так, Эва?» — ласкава пытаецца спявачка, закручваючы вакол пальца міліраваную, завітую плойкай пасму.

«Не, усё нармалёва», — Эва засмучана выдыхнула, зразумеўшы, што нават уласная патэльня перастала належыць ёй.

Пастар Фаўст палічыў Эвін спакой за добры знак: дачка прывыкне да новай гаспадыні. Сябраваць будуць!

Не будуць. Эва ўскаквае ў машыну і гоніць па дарозе пад войканне Сені. Яны амаль не размаўлялі.

Прыехалі ў новую кватэру. Вынеслі з машыны рэчы. Развітваюцца.

«Дзякуй табе, Сеня, — Эва трымае сяброўку за руку. — І яшчэ раз даруй за ўсё гэта».

«Тэлефануй, калі што».

На гэта Эва нічога не адказала.

Дзея 2

Пастар Фаўст, развітаўшыся з харысткай, ідзе ў Эвін пакой. Гнеў бацькі сціх яшчэ даўно. Ён вырашыў, што не будзе крычаць на дачку, чаго б яна яму не сказала. Проста памірацца, памаляцца і лягуць спаць.

Што ж… бедны пастар Фаўст ледзь не звар'яцеў, убачыўшы апусцелы пакой. Ён кінуўся тэлефанаваць Эве. Якраз у гэты час яна ехала разам з Сеняй у новы дом.

«Сеня, скажы, што я за рулём», — сказала Эва.

Сеня выцягнула з Эвінага заплечніка тэлефон:

«Гэта пастар Фаўст».

«Тады не падымай!»

Бедны бацька, які сядзіць на падлозе апусцелага пакоя, ізноў і ізноў набірае нумар дачкі. Толькі позна ўвечары ён здагадаўся патэлефанаваць Сені. Яна ўжо была ў сябе дома. Сеня не адразу спазнала дрыготкі, прыціснуты голас Фаўста. Дзяўчына, пашкадаваўшы беднага бацьку, выклала яму, што Эва арандуе кватэру ў сваёй выкладчыцы. Больш Сеня нічога не ведала. Яна не запомніла ні адрас, ні нават назву вуліцы, але паабяцала звязацца з Эвай і адразу ператэлефанаваць пастару.

«Сеня, ты сама ведаеш, што я не буду з ім размаўляць», — бурчыць Эва.

«Што мне яму сказаць?»

«Так і скажы, што я не хачу больш ведаць яго».

Сеня слова ў слова перадала адмову пастару. Дзяўчына дагэтуль не чула, як плачуць мужчыны.

А Эва тым часам, не без ваганняў, выцягнула сімку са свайго тэлефона і разламала з цвёрдым намерам купіць заўтра новую.

А бацька на наступны дзень узняў міліцыю. Міліцыянты паабяцалі нешта зрабіць, але іхняга імпэту было нямнога. Тады пастар Фаўст пратрос увесь факультэт: пошукі ўскладніла тое, што ён не памятаў, на якой спецыяльнасці і на якім курсе вучыцца ягоная дачка. Але ва ўніверсітэце нічога не ведалі пра цяперашняе месцазнаходжанне Эвы. А дзяўчына, разумеючы, што яе бацька хутчэй за ўсё пачне пошукі менавіта адсюль, не пайшла на пары ў гэты дзень. Выкладчыца, што здала кватэру Эве, была загадзя папярэджана і не прызналася, дзе жыве яе студэнтка.

Апошняя надзея — нядзеля. Фаўст усю пропаведзь шукаў вачыма дачку ў зале. Эва не прыйшла, затое прыйшла Сеня. Пасля набажэнства бедны Фаўст схапіў Сеню ў калідоры, учапіўся дрыготкімі пальцамі ў ейныя рукі.

«Сеня, дапамажы мне. Я рэабілітую цябе… я зраблю так, што ў царкве ўсе будуць любіць цябе… Сеня, толькі не пакінь… дапамажы!» —

«Не дай Бог, каб мяне любілі людзі!»

«Ты памятаеш дарогу туды?» — спытаў пастар.

І яны паехалі. Але Сеня не памятала дарогі: гэтыя аднатыпныя кварталы з ідэнтычнымі шматпавярхоўкамі блыталі Сеню, якая ўсё жыццё пражыла ў ціхім, спакойным раёне. Яны аб’ездзілі

ўвесь мікраграён некалькі разоў, пакуль пастар, прызнаўшы сваю няўдачу, не адвёз стомленую Сеню дадому.

Адрас высветліўся вельмі нечакана праз некалькі дзён. Тая выкладчыца не магла спакойна заснуць: яе катавала сумленне, што яна не прызналася бацьку, дзе жыве Эва. І толькі зараз, глыбокай ноччу, вырашыла патэлефанаваць. І пастар ёй адказаў.

Акт 3

НОЧ РАССТРАЛЯНЫХ ПАЭТАЎ

Дзея 1

У гэтую самую ноч, калі выкладчыца тэлефанавала пастару, Сеня таксама не спала. Яна адчувае сябе кепска з таго самага часу, калі ў царкве да яе пачалі ставіцца дзіўным чынам, лічачы яе не сваёй. А як жа ёй быць сваёй, калі Госпад просіць кожнага чалавека звярнуцца да Яго і прапаведаваць тое, што не ўсім даспадобы.

Сеня не можа больш тут заставацца. Ёй трэба з'ездзіць у вёску да бацькоў хаця б на пару дзён — развеяцца. Яна ўскаквае, пераапранаецца, не збіраючы рэчаў шыбуе на вакзал. Добра, што бліжэйшы цягнік праз дваццаць хвілін. Пачакаем.

Вось і цягнік, яна знаходзіць месца, прыстройваецца. Сон пачынае ахутваць яе.

Станцыя. Сеня ўскаквае, куляй ляціць з вагона. Цяпер яна на цёмным пероне пасярод лесу. Гэта не тая станцыя! Добра, што тут недалёка стаіць вёсачка, з цэнтра якой выглядае вялізны касцёл, дзе гарыць святло. Гэта азначае, што ў царкве нехта ёсць, а калі там нехта ёсць — яна можа разлічваць на дапамогу. Сеня перадумала вяртацца да бацькоў: хоча ехаць назад. Толькі не ноччу: наступны цягнік будзе праз тры гадзіны.

Дзея 2

Айцец Наласка, стары ксёндз, некалі быў настаяцелем касцёла. Айцец Нікалас — малады святар, адзначаны біскупствам за сваю кемлівасць, заняў месца настаяцеля. Ягоныя памагатыя, іншыя чатыры святары, з вайсковай дакладнасцю выконваюць кожны загад свайго верхавода. Настаяцель Нікалас бачыць прыхільнасць парафіі (а разам з гэтым — спрыяльнасць) менавіта да старога айца Наласкі. А чалавека, які нядаўна быў на тваім месцы, трэба абысці і стаць лепш за яго, а калі гэтага не атрымліваецца — зрабіць яго горшым за сябе прымусова.

Стары Наласка, з хворай на рак шыяй, прылёг у кабінеце на канапу адпачыць перад начной імшой. Знянацку нейкая сіла пацягнула яго за сутану. Ксёндз войкнуў, і дзве дужыя маладыя рукі ўчапіліся ў галёнкі. Другая пара рук высунулася з цемры, схапіўшы старэчыя далоні. Два чалавекі расцягнулі беднага святара на канапе, і трэці схапіў хворую шыю, душачы слабую ахвяру. Чацвёрты сеў побач на канапе, уціснуў вострай рукой старыя грудзі ў матрац, і левай трымаў ліхтарык, свецячы прама ў спалоханыя вочы айца Наласкі, які не мог ні ўздыхнуць, ні крыкнуць. Ён адчуў сябе параненым гракам, з якім па сваім малалетнім неразуменні гуляюць дзеці.

Святло ўключаецца: прыйшоў айцец Нікалас.

«Гэта вы так рыхтуецеся да набажэнства? Імша праз пятнаццаць хвілін!»

Чатыры святары-каты падняліся і выйшлі,

пакінуўшы Наласку аднаго. Лежачы на канапе, стары, хворы, стомлены, ён успамінае мінуўшчыну, калі ўсё было добра, калі яго любілі і ён любіў, калі з яго не здзекаваліся і не мучылі… Напэўна, ён так і памрэ адзін. Зусім адзін.

Цяпер ён ідзе да вернікаў. У касцёле дзве спавядальні: у першую сеў той самы святар, які яго толькі што душыў. На споведзь сабралася цэлая чарга. Айцец Наласка ветліва махнуў рукой вернікам, падыходзячы да другой спавядальні, і ўся чарга арганізавана, разам перамясцілася да спавядальні Наласкі. Каюцца звычайна адны і тыя ж, і нават фіранка не перашкаджае спазнаваць вернікаў па голасе. Ён слухае і мякка падбадзёрвае, суцяшае, распавядае. Святарскае сэрца гарыць: ён адчувае былую ласку і любоў. Так бы і правёў рэшткі жыцця тут, з паствай!

Чарга скончылася, айцец Наласка выходзіць, апынуўшыся ў абдымках настаяцеля Нікаласа. Гэты хіты святар уцяміў, што чым ласкавей ты ставішся да Наласкі, тым лепш парафія ставіцца да цябе, да сябра іхняга любімага святара. Айцец Наласка не перашкаджае настаяцелю граць у сяброўства, бо мяркуе, што няма чаго адбіваць у людзей веру, агаляючы канфлікты. Пачынаецца імша.

Грукнулі дзверы. Усе вочы — на Сеню, якая спазнілася. Яна сядае на апошнюю лаву, слухаючы ціхія спевы. Яе сэрца размякчаецца. На казань выходзіць стары айцец Наласка:

«Што такое давер? — пачынае стары ксёндз. — Гэта калі аддаеш Богу сваё сэрца…»

Сеня даўно не чула такіх простых і Боскіх казанняў. Яе сэрца гарыць.

Набажэнства скончылася. Настаяцель Нікалас нядбайна хапае за руку айца Наласку ў куту.

«Цюкаюць беднага айца», — уздыхае Сеня.

Яна вырашае застацца на ноч тут, у царкве. Зняўшы чаравікі, кладзецца на лаву. Людзі разыходзяцца. Пара вернікаў засталася пагутарыць з айцом Наласкам. І пакуль ягонае шчырае сэрца грэе хрысціянаў, Нікалас шукае сабе прымяненне. Убачыў: вунь там, у цёмным куту, ляжыць постаць. Што гэтаму чалавеку патрэбна? Ён што, беспрытульны ці п’яніца? Настаяцель Нікалас рушыць да Сені. Айцу Наласку зашчаміла сэрца ў хваляванні за беднага чалавека, які, пэўна, прыйшоў шукаць падтрымкі ў Госпада і цяпер яго пакараюць за гэта. Наласка адпускае вернікаў, пераганяе настаяцеля ў самай Сенінай лавы.

«Я з табой потым паразмаўляю», — рыкае Наласку настаяцель Нікалас, паварочваючы назад.

Айцец Наласка стаіць за спінкай лавы. Акуратна, каб не напужаць Сеню, трыма пальцамі хлопае яе па плячы. Дзяўчына расплюшчвае вочы. Яна не толькі не спужалася айца Наласку (пасля гутарак з пастарам Фаўстам цяпер яе ніводзін ксёндз не напужае), нават наадварот — узрадавалася. Сеня радасна ўскаквае, апранае чаравікі. Ксёндз сядае побач.

«Табе патрэбна дапамога?»

«Што вы! Проста я чакаю цягнік. Думаю, ён хутка прыедзе».

«Я магу цябе праводзіць на станцыю».

«Буду рада!»

Абое выходзяць з касцёла.

«Скажыце, войча, — няёмка пачынае Сеня, — вас у царкве крыўдзяць?»

Айцец Наласка ўздыхае:

«Як ты гэта зразумела?»

«Бядак бедака бачыць здаляка».

«А цябе хто крыўдзіць, дзіця?»

«Ды нашыя пратэстанцкія прапаведнікі…»

«О, Божа! Ты пратэстантка! А я — каталік».

«Я заўважыла».

Няёмка ідуць далей.

«І як вы з гэтым спраўляйцеся, войча?»

«З тым, што я каталік?»

«З тым, што вас крыўдзяць».

«Цярплю».

«А гэта правільна?»

«Напэўна. Госпад выпрабоўвае нас, ці будзем мы вернымі да смерці».

«І вы будзеце?»

«Малюся, каб так яно і было. А вось і станцыя».

Хутка пад'язджае цягнік. Стары ксёндз садзіць Сеню ў вагон.

Дзея 3

Стомлены святар вяртаецца ў касцёл. Ён абыходзіць царкву ў надзеі сустрэць настаяцеля. Але Нікаласа тут няма, і касцёл застаўся адчынены. Так нават лепш: Наласка ходзіць па царкве, выцірае абразы. Яго сэрца ласкава трымціць, калі святар разглядае выявы родных людзей, з якімі ён пазнаёміцца ў будучым жыцці. Святарскія ногі падгінаюцца праз стому. Знясілены Наласка лажыцца на лаву. На тую самую лаву, дзе нядаўна ляжала Сеня.

«Божа, я люблю Цябе», — усміхнуўся святар і заплюшчыў вочы.

Настаяцель Нікалас хутка вярнуўся, навіс над старым ксяндзом.

«Войча, пад’ём!» — Нікалас штурхае ў жывот Наласкі.

Безвынікова. Нікалас пхае больш жорстка і ў жывот, і ў бок, і ў спіну. Безвынікова. Нарэшце, Нікалас пачынае разумець, што адбываецца: правярае пульс, дыханне. Сэрца Наласкі больш не б’ецца. Настаяцелю Нікаласу стала не па сабе.

Акт 4

ТРАГЕДЫЯ ФАЎСТАЎ

Дзея 1

У гэту ноч, калі Сеня адправілася ў начную вандроўку, а выкладчыца патэлефанавала пастару Фаўсту, Эва сядзела а трэцяй гадзіны ночы за камп'ютарам з дакладам, сціскаючы ў руцэ энергетык. Чаму бацька так і не знайшоў яе за гэты тыдзень? Ён забыў пра яе, закахаўшыся ў харыстку? Ці ён настолькі дурны, што за столькі дзён так і не змог яе знайсці? Эва не ведае, што з гэтага страшней. Яна амаль не ела пару дзён. Эве проста не да гэтага: шмат працы ва ўніверсітэце.

Знянацку схапіла сэрца. Пасядзеўшы так яшчэ колькі хвілін, Эва не вытрымала — трэ прымаць таблеткі. Толькі яна ўскочыла з крэсла, у вачах усё паплыла, сэрца схапіла. Галаву дзяўчыны напоўніла страшная думка, што гэта канец. Яе нежывое цела павалілася на падлогу.

Праз паўгадзіны Эвіна выкладчыца круціць ключамі ў замочнай шчыліне пад пільным пастарскім позіркам. Абое ўлятаюць у кватэру. Цела. Бедны Фаўст валіцца побач з дачкой, абдымае дзяўчыну, галосіць:

«Эва, Эвачка!»

Выкладчыца правярае пульс, якога няма.

«Пэўна, інфаркт, — рыдае бацька, — у яе хворае сэрца… было».

Пастар тэлефануе ў хуткую дапамогу. Выкладчыца робіць штучнае дыханне. Ёсць надзея на паратунак, бо разліты энергетычны напой яшчэ не выпарыўся, значыць, Эва ўпала яшчэ зусім нядаўна. Штучнае дыханне не адрадзіла дзяўчыну. Не дапамаглі і лекары хуткай. Цела павезлі ў морг.

Дзея 2

Але для Эвы нічога яшчэ не скончылася. Наадварот: усё толькі пачынаецца. Апынуўшыся без цела, Эва адразу ўцяміла, што яна некуды правальваецца і што гэтае «некуды» нішто іншае, як пекла. Дзяўчына трапіла ў цёмную і незразумелую мясціну. Яна не бачыць ні пякельнага агню, ні дэманаў, але сэрца напоўнена страхам і адчаем.

Раптам аднекуль здалёк да яе з прыемнай усмешкай падыходзіць прыгожа апрануты хлапец інтэлігентнага выгляду. Эва яго нават не спужалася.

«Вітаю, — усміхаецца хлопец. — Мяне зваць Люцыфер».

Эву перасмыкнула:

«Люцыфер? Чаму ты такі нястрашны?» — ёй усё яшчэ здаецца, што гэта нейкая фікцыя.

Люцыфер зусім не пакрыўдзіўся:

«А чаму ты вырашыла, што я павінны быць страшным?»

«Ну… у Біблii так напісана».

«Бачна, што ты яе ніколі не чытала, бо абапіраешся на словы свайго бацькі. Дзіўна, што ты ўсё яшчэ верыш яму».

Эве стала дужа брыдка за крывадушніка-бацьку:

«Але Біблія — Кніга не толькі майго бацькі, але яшчэ і Сені. А яна вельмі шчырая».

«А ты любіш Хрыста, як і яна?»

Эва апускае вочы.

«Я рады, — працягвае Люцыфер, — што ты такая ж шчырая, як і твая сяброўка. Цябе чакае вялікая будучыня».

«Але я памерла!»

«І што? Мы ўсё яшчэ можам узяць рэванш! Ты знаеш, што Бог скінуў мяне праз мой гонар. Бо я быў таленавітым анёлам і таксама прагнуў справядлівасці, як і ты. Госпад спужаўся мяне, што я займу Ягонае месца, таму выгнаў. Потым я прыйшоў да людзей, каб даць ім свабоду. Але Бог выгнаў і Еву з Адамам. Дзякуючы гэтаму ты цяпер вольная».

«То бок, ты хацеў дапамагчы нам, людзям?»

«Канешне! Я хацеў, каб вы пашырылі межы свайго разумення і разам са мной зрынулі Бога з Яго пасады. Бачыш, колькі зла на зямлі? А ў царкве? Ісус не можа разабрацца нават з гэтымі прайдзісветамі-прапаведнікамі, а я магу! І дакажу ўсім гэта! Але мне патрэбна твая дапамога, Эва».

«Калі гэта сапраўды так, як ты мне распавёў, я з ахвотай дапамагу табе!»

Межы цемры рассейваюцца. Эва бачыць круглую залу, дзе праходзіць сейм дужых гэтага свету. За круглым сталом сядзяць Рымскі Папа, Патрыярхі, пратэстанцкія біскупы з сусветнымі імёнамі…

«Ты падмануў мяне! — крычыць Эва шатану. — Ты працуеш з гэтымі нягоднікамі!»

Люцыфер хапае яе за шыю і душыць. Дзяўчына страчвае сілы.

«Ну і дзе твой Бог?» — зло смяецца д’ябал.

«Дакладна! Бог мне можа дапамагчы!» — зразумела Эва.

Яна стараецца вымавіць імя Ісуса Хрыста, як калісьці вучыў яе бацька. Страшэннае пачварнае

аблічча шатана, якое замяніла былы прыгожы твар Люцыфера, цяпер адлюстравала жах перад нечым, што стаіць за спінай Эвы. Дзяўчына з трымценнем паворочваецца: Хто Ён, Каго баіцца д’ябал?

Ісус! Ён прыйшоў! Эва разумее, што Бог адгукнуўся на малітву, пэўна, не для таго, каб пакінуць яе гінуць. Магчыма, яшчэ ёсць шанец.

«Сапраўды, табе яшчэ ёсць шанец», — спакойна адказвае Хрыстос.

Эва ўздыхае з палёгкай. Яна ўжо не бачыць ні д’ябла, ні бесаў, ні круглы стол, ні чарнату. Толькі строгае аблічча Хрыста.

«Чаму Я павінны радавацца, Эва?» — з лагоднай строгасцю пытаецца Ён.

«Я не вартая паратнку. Даруй за здраду», — баіцца Эва.

Раптам Ісус усміхнуўся. Яны апынуліся ў месцы, падобным да раю.

«І гэта ўсё? Больш ад мяне нічога не патрабуецца?» — дзівіцца Эва.

«Пакаянне падаецца простым, але многія людзі так і не просяць у Бога прабачэння».

У Хрыстовых руках з'яўляецца брудны кубачак з-пад кавы.

«Што гэта, Божа?»

«Твая душа».

Ісус апускаецца да рачулкі жывой вады, што цячэ каля Ягоных ног, і адмывае посуд дачыста. Ды так, што той заззяў быццам келіх, высечаны

з цэльнага дыямента. Святое святло праходзіць скрозь празрыстыя сценкі і ад кубка льецца вясёлка.

Ісус бярэ другі келіх і налівае празрыста-залаты алей.

«Чалавек напаўняецца Божым Святлом, калі прыходзіць да Бога і каецца».

«То бок… чалавек, фактычна, становіцца Божым Целам?» — Эва так захапілася гэтай думкай, што ажно спужалася.

Промні радасці сыходзяць з аблічча Хрыста:

«Але трэба быць лагодным і паслухмяным Майму Айцу, каб захаваць сасуд у чысціні. Вазьмі яго і пакажы свайму бацьку і іншым людзям».

Эва беражліва бярэ посуд у свае рукі.

Прачынаецца. Побач ляжыць знясілены горам бацька, абдымаючы любімую дачушку.

«А куды мы едзем?» — пытаецца Эва.

«У морг», — адказвае тата.

Ён усхапіўся. Валіцца непрытомны на падушку. Тут жа ўзнімае галаву з усмешкай, поўнае слёз:

«Дзе ён?» — бянтэжыцца Эва.

«Хто?» — ахнуў бацька.

«Сасуд, які мне даў Хрыстос!»

Бацька ўсё разумее, усміхаецца:

«Тут, — кладзе на даччына сэрца руку, — у тваім сэрцы».

У сценах роднай бацькавай кватэры Эва распавяла тату дзіўную гісторыю. Старэйшы Фаўст прыціх: які ж ён пастар, калі яго дачка трапіла ў пекла?

«І што трэба нам рабіць?» — пытаецца ён.

«Паказаць гэты сасуд іншым людзям. Толькі я не разумею, як гэта зрабіць».

«Усё зразумела: трэба пакаяцца і жыць не сабой і сваім розумам, а Хрыстовым сэрцам. Толькі нас за гэта будуць лічыць вар'ятамі нават у царкве, як гэта адбылося з Сеняй».

«Усё роўна, што скажуць людзі! — заключае Эва. — Галоўнае, каб не сядзець усю вечнасць у возеры вогненным побач з крывадушным шатанам».

Фаўсты ўпершыню за догі час разам становяцца на калені з малітвай пакаяння. Першым пачынае пастар:

«Божа, даруй мне. Я адкінуў Цябе і прапаведаваў тое, што хацелі пачуць людзі, — ласкава глядзіць на Эву: — Дачушка, даруй мне, што так абышоўся з табой».

«Тату, і ты мне даруй. Дарэмна я ўмяшалася ў вашы з харысткай адносіны. Яна моцна пакрыўдзілася?»

Пастар адмахваецца:

«Яна сказала, што калі мне дачка даражэй за яе, дык не выйдзе за мяне».

«Папрашу і ў яе прабачэння за свае жорсткія словы».

Пастар туліць дачушку да грудзей.

«У цябе такі ж востры язычок, як у мамы».

«Сапраўды?» — Эва наіўна глянула на тату.

Ён ласкава пасміхаецца:

«Мне падабалася глядзець на тваю маму, калі яна смела адстойвала сваю думку. Таму я ажаніўся з ёй...»

Акт 5

ДЗЕЛЯ ХРЫСТА ДЫХАЕМ, ДЗЕЛЯ ХРЫСТА ЖЫВЁМ

«Быць верным да смерці… — Сеня разважае над словамі старога айца Наласкі. — Божа, малю Цябе, каб я была такой жа адданай Табе, як і той цудоўны ксёндз!»

Дзяўчына сядзіць на траве ля царкоўнага ганка. Падыходзіць дырэктар тэалагічнага інстытута пан Грэм. Цікаўна пытае, усміхаючыся белымі зубамі:

«Сеня, з табой усё нармальна? Чаму ты сядзіш на траве?»

«А дзе ж мне яшчэ сядзець?»

«На лаве».

«Падсудных?»

Грэм засмуціўся гэтаму адказу.

Тут прыляцелі Фаўсты. Яны нават не звярнулі ўвагі на Грэма, падхапілі Сеню пад рукі і панесліся ў царкву.

«А я нічога яшчэ не зрабіла, вартага пакарання», — Сеня скоса глядзіць на шчаслівага пастара Фаўста.

Служыцель пакінуў дзяўчат у сваім кабінеце, а сам пабег у трапезную паклапаціцца пра ежу. Пакуль Эва расказвала ўсю сваю гісторыю, Сеня плакала шчырымі слязамі.

«Слава Богу, што я дажыла да таго часу, калі ў царкве запануе Святая Праўда!»

Пастар вярнуўся з дзвюма талеркамі кашы.

«Мы так палюбілі прысмакі, што забылі пра сапраўдную ежу», — кажа старэйшы Фаўст.

Сеня кінулася на шыю засмучанага пастара. Колькі хвілін сядзяць у абдымках.

«Эва, — спалохаўся тата, — калі ласка, правер пульс. Здаецца, Сеня не дыхае».

Але Фаўсту не падалося. Гісторыя з хуткай дапамогай ізноў паўтарылася — на гэты раз без цуду.

На пахаванні Ксенафонціі Пфляўмбаум, якую ўсе папросту звалі Сеняй, былі чатыры чалавекі: яе бацькі і Фаўсты. Ля суседняй магілы стаіць нейкі ксёндз. Пастар Фаўст разгаварыўся з ім. Высветлілася, што святара завуць Нікаласам. Ён — настаяцель касцёла.

«Было ў айцу Наласку нешта асаблівае, — кажа пра нябожчыка святар. — Я яго не любіў, але нешта было ў гэтым старым хворым чалавеку не такое, як ва ўсіх астатніх…»

ФАУ

Акт 1

СТРАШНАЕ МІНУЛАЕ

Дзея 1

Дытрых Шміт — так завуць таго канструктара, якога даслалі заахвочваць канцлагер на будаўніцтва ваеннай ракеты Фау-2. Яго родная сястра Фрыда, якая насуперак чаканням бацькоў узялася за такую сур'ёзную справу, як падарожжа ў касмічныя прасторы, скептычна паставілася да ідэі вышэйшага кіраўніцтва прымушаць працаваць над ракетамі знясіленых вязняў. Сапраўды, у гэты канцлагер адбіралі зняволеных з інжынернай адукацыяй. Але хіба яны будуць старацца на карысць дзяржаве, якая аддала іх на смерць?

Нельга сказаць, што Фрыда і Дытрых былі за вайну. Гэтыя людзі гадамі сядзелі за чарцяжамі самаробных ракет і доўга лічылі космас простай марай. Вайна перайграла ўсе карты. Нямецкі ўрад меў свой разлік на ракеты. Улада бачыла новую зброю, таму ўзялася за фінансаванне праекта.

Канешне, Дытрых і Фрыда ведалі, што ствараюць страшную машыну для вынішчэння людзей, але не надавалі гэтым разважанням вялікай увагі і стараліся не абмяркоўваць гэту думку паміж сабой. Але заплюшчваць вочы на ўсе тыя жахі было складана.

Фрыда першая зразумела, якая адказнасць ляжыць на іх. Здарылася гэта тады, калі яна з групай

інжынераў прыехала ў канцлагер. Яе любімы брат Дытрых, якога па-хатняму называюць Дзірк, гэты спакойны чалавек, «наводзіў парадак» сярод вязняў. Ён стаяў і глядзеў на дзесяцярых чалавек, якіх зараз павесілі на машыне за сабатаж па яго загадзе. Фрыда ніколі не зможа забыць, як гайдаліся скураныя шкілеты, калі металічня бэлька ўзнялася над шэрым натоўпам загнаных на паказную казнь вязняў.

Калі Фрыда засталася адна з Дытрыхам, схапіла яго за плечы і рыкнула ў твар:

«Дзірк, што ты робіш? Ты забіў людзей!»

Дзірк са звычайным спакоем, знаёмым сястры з дзяцінства, будзённа адказаў:

«Гэтыя людзі халтурылі. Упэўнены, праз іх недаробкі мноства ракет не ўзнімуцца ў паветра».

Фрыда адхіснулася ад спакойнага брата. Яна не бачыць ужо таго Дзірка, з якім яна калісьці летуценна глядзела ў зорнае неба, марыла пра вялікія падарожжы.

Дзея 2

Сапраўды, Дытрых дбаў за ракеты. З дзяцінства праводзіў большасць вольнага часу ў сваім пакоі, не церпячы нічыёй прысутнасці, акрамя старэйшай сястры. Калі яму прыйшлося кіраваць навукоўцамі, тыя хутка заўважылі яго адарванасць ад рэальнага жыцця. Любая неакуратнасць для Дытрыха была недапушчальнай. Недасканаласцю ён лічыў усё, што можна было зрабіць лепей. Рабіў шмат заўваг, загадваючы перарабіць тое і гэтае, што не магло не адлюстравацца на тэмпе працы канструктараў. Нарэшце, Дытрых пачынаў нервавацца, прыціскаць людзей, крычаць і біць іх скруткамі паперы па галаве, за што і быў высланы далей вар’яцець у канцлагер.

Цяпер яго задачай было адсочваць працэс пабудовы ракет, рабіць заўвагі, тлумачыць. Але Дытрых не выглядаў злосным на фоне тутэйшых наглядчыкаў. Мог ударыць таго, каго злавіў на сабатажы, і тое нячаста. Ён лічыў, што лепш адразу перадаць вінаватага жорсткім наглядчыкам.

Дзея 3

Канструктар Вальфрам Іванавіч Ляцягін ад пачатку ведаў, што вайна скончыцца для Нямеччыны паразай. Яго бацька, таксама інтэлігент, уцёк з Расіі ад непазбежнай рэвалюцыі. Таму Вальфрам не верыць ні рускім, ні немцам — анікому. Ляцягін адчувае, што Чырвоная армія станцуе на яго костках, бо ён рускі, сын буржуя, ды яшчэ канструюе нацыстам ракеты.

Ёсць адзін вязень, які Ляцягіну падабаецца. Гэта пастар Клімент. Праўда, для пастара ён занадта малады, але ягоны біскуп перад сваёй смерцю настаяў пасвяціць хлопца раней за прыняты тэрмін. Быў Клімент на волі пастарам нядоўга, хутка трапіў сюды за «нядобранадзейнасць». Вальфрам Іванавіч даўно прыкмеціў яго сярод іншых нявольнікаў, бо святар любіць палымяна прапаведаваць вязням падчас абеда, што нават наглядчыкі пільна слухаюць. Толькі Дытрыху гэта не падабаецца: пропаведзі адцягваюць увагу ад працы!

Таму Дытрых з Ляцягіным пайшлі ў барак да Кліма: прасіць пастара скіраваць красамоўнасць на карысць працы, заахвочваючы вязняў адказна ставіцца да пабудовы ракет.

Пільныя вочы Дзірка адразу прыкмецілі дваіх замораных, што адвярнуліся да сцяны.

Кволы пастар Клімент не адпускаў хворага дзядзьку з поўнымі бакамі (пэўна, нядаўна ў канцлагеры). Клім гладзіў, абдымаў, шкадаваў знясіленага чалавека, расціраў кароткія пальцы

няшчаснага і дыхаў белым воблачкам пары на ледзяныя далоні сябра. Куточак вуснаў паўнаватага мужчыны выражаў нешта нашталт застылай усмешкі. Ляцягін зразумеў усё адразу: да раніцы гэтага чалавека ўжо не будзе.

Дытрых пхнуў Вальфрама Іванавіча:

«Яны нешта хаваюць».

«О, Дзірк, кінь думаць, што ўсе супраць цябе! Пастар праводзіць у апошні шлях хворага…»

«Пастар проста стараецца схаваць якую-небудзь скрадзеную з майстэрні прыладу, каб падраць калючы дрот і ўцячы!»

Клімент павярнуўся спінай да сябра, падставіўшы сухія грудзі Дытрыху на выпадак удару.

«Круціцца як вуж на патэльні. Дакладна нешта хавае. Вольфе, правер яго».

Ляцягін не спрачаецца. Клімент лагодна падняўся, і інжынер разы два правёў пальцамі па вострых рэбрах.

«Тады паглядзі гэтага», — Дытрых паказаў на хворага.

Ляцягін праверыў і хворага.

«З якога часу мы з табой прамянялі халаты навукоўцаў на адзенне наглядчыкаў?» — Вальфрам Іванавіч павярнуўся да сябра і пільна паглядзеў на яго.

Дытрых не адказаў.

Клімент прымасціўся назад да хворага, моўчкі ўткнуўся ў мяккія хрыплыя грудзі. Кулак Дзіка абваліўся на кволае пастарскае плячо. Клімент затрымаў паветра ў горле, каб не застагнаць.

«Пайшоў адсюль!» — гаркнуў Дытрых.

Клімент мацней абдымае хворага. Ляцягін ведае: Дзірк не адступіць, ды і пастар таксама. Бяда будзе.

«Кліме, хадзі сюды!» — кліча лагодна голас з кута.

Малады пастар паслухмяна падняўся і моўчкі паплёўся на нары старэйшага чалавека, азіраючыся на бедную хворую постаць. Ляцягін хвалюецца, што Дзірк нешта ўчыніць. Але Дытрых пайшоў на выхад.

Дзея 4

Ляцягін быў ужо на нагах, калі вязняў пагналі на працу. Ён шыбуе ва ўчарашні барак. Канструктар быў на месцы, калі натоўп выйшаў з памяшкання. Вальфрам Іванавіч старанна выглядвае дваіх. Іх няма. Ляцягін з трапяткім сэрцам уваходзіць у доўгую пабудову. Клімент, заўважыўшы яго, нібы здранцвеў, узяўся за хворага:

«Пайшлі, братка», — пастар прытуліўся тварам да поўнай шчакі.

«Ідзі адзін, я ўсё роўна каталік», — хрыпіць хворы.

«І што? Падымайся!» — Клімент спалохана паглядае на Ляцягіна.

«Давайце дапамагу», — умешваецца Вальфрам Іванавіч.

Клімент прыціскаецца да сябра. Узрушана пазірае на Ляцягіна.

«Вы хаця б занаёмы?» — інжынер прыхапіў хворага пад пахі.

«Як цябе зваць? — пастар памагае Ляцягіну прыўзняць падапечнага. — Мяне завуць Клімент»,

«Я — Паўль».

«Ну вы даяце! Столькі часу прабыць разам і не пазнаёміцца», — смяецца Ляцягін.

Дзея 5

Ля барака чакаў няправеднаасуджаны пастар Альберт. Гэта быў той самы чалавек, якога паслухаўся ноччу Клімент, пакінуўшы на пэўны час Паўля. Наогул, Клімент заўсёды слухаў старэйшага служыцеля Альберта.

Калі Ляцягін пайшоў, пакінуўшы пастараў з хворым, Альберт з нотай пакуты сказаў Кліму:

«Я падраў правады, а цяпер хвалююся».

«Хто падраў правады?» — выскачыў аднекуль Дзірк.

«Я!» — секануў Клім.

Збялелы Альберт затыкае рот сябру, крычыць:

«Я!.. Я зрабіў!»

Але Дытрых ужо схапіў аберуч галаву Кліма. Пару секунд канструктар адчуваў пульсацыю артэрыі пад халоднай далонню. Дзірку не хапіла часу, каб асэнсаваць, што ў яго руках жывы чалавек. Канструктар крутануў галаву Клімента, і хлопец паваліўся яму пад ногі. Пастар Альберт кінуўся да маладога чалавека. Дытрых стукнуў старэйшага пастара ў жывот, і той паваліўся поруч з юным сябрам. Напужаныя вочы Паўля ацвярозілі Дзірка. Канструктар канчаткова зразумеў, што ён зрабіў, калі слабы Альберт залямантаваў над яшчэ жывым Клімам.

Дзея 6

«Абяцаю, я паклапачуся пра яго...»

Чамусьці Альберт адразу паслухаў Дытрыха, пайшоў з Паўлем...

Дзірк не ведае, што рабіць. Мілы пастар памірае праз ягоную руку, а ён не чакаў, што зможа забіць яго! Да сёння Дытрых лічыў сябе добрым чалавекам. Ногі Дзірка дранцвеюць, ён падыходзіць да цела. Сядае. Інжынер чамусьці вырашыў, што трэба ўзяць руку Кліма. Паўжывы чалавек расплюшчвае зморшчаныя, як у птушкі, вочы. Дзірку страшна.

«Прабач мне».

Клімент замілавана заплюшчыў вочы:

«Люблю…»

«Каго?»

«Цябе, Дзірк».

Дытрых у слязах паваліўся на яго.

«Цябе б абняць ды й самому заплакаць, дружа, — ледзь прамаўляе пастар. — Калі я буду там, дзе да мяне не даляціць ніводная ракета, я буду з малітвай успамінаць цябе, бо ты мяне многаму навучыў».

«Чаму я навучыў цябе?»

Дытрых уткнуўся носам у твар пастара. Аказваецца, што кожны чалавек, пакуль ён жывы, мае гарачае дыханне...

Акт 2

АДРАДЖЭННЕ ДУХА

Дзея 1

Той дзень перамяніў жыццё Дытрыха. Ён стаў задуменным, ужо не прыходзіў глядзець, як працуюць вязні. Апошнія дні вайны прайшлі ў тумане: Дзірк прапусціў, калі інжынеры ўцяклі да саюзнікаў, бо схапіў інфаркт і ляжаў у хаце за пару кіламетраў ад канцлагера. Ляцягін разумеў, што пасля саюзнікаў прыйдуць рускія. Трымаючы халодную руку замучанага Дытрыха, Вальфрам Іванавіч спадзяваўся, што за імі прыйдуць амерыканцы ці англічане. Але за імі прыйшлі рускія.

Ды найгоршыя думкі Ляцягіна, што яго, рускага, які працаваў на немцаў, заб'юць, не спраўдзіліся. Ён каштоўны, бо важны навукоўца, а лепшыя спецыялісты на дарозе не валяюцца, каб іх проста забіваць.

Вальфрам Іванавіч добра ўладкаваўся ў Саюзе: меў грошы, машыну, дачу. Лепш за яго жылі толькі Дытрых і Фрыда: яна і яшчэ адзін юны навуковец Зігфрыд таксама былі затрыманы савецкімі салдатамі.

Яны ўчацвярых трымаюцца нямецкім гуртком сярод рускіх навукоўцаў. Іх не чапаюць: толькі Ляцягіна торкаюць, бо ён, рускі, працаваў на немцаў. Дытрыха баяцца праз яго страшную мінуўшчыну. Ён ні з кім не сябруе. Нават Фрыда не ведае, як падступіцца да свайго брата. Ляцягін мяркуе, што лепш яго не чапаць.

Зігфрыд адзіны, хто не баіцца Дытрыха. Дзірк заўсёды падаваўся яму рупліўцам, бо калі чалавек старанна дбае пра нежывыя ракеты, якім уважлівым будзе ён да жывога чалавека! Дытрых сапраўды кожнай фібрынай душы адчуваў адказнасць за курчавага рыжага хлапца, які патрабуе да сябе ўвагі больш за астатнюю навуковую моладзь.

Аднаго разу Зігі чарговы раз выслухоўваў рэкамендацыі Дытрыха пра беспарадак на стале і надта тлустыя рысы чарцяжа. Тады Зігфрыд прызнаўся, што ў яго баліць галава. Дытрых не знайшоў, што сказаць. Ён быццам бы забыў, што ў людзей можа штосьці забалець.

«У мяне праблемы з сасудамі», — растлумачыў Зігі, спадзеючыся на шкадаванне настаўніка.

Дзірк абхапіў яго. Адчуўшы пульсаванне артэрыі, ён схамянуўся.

«Што такое?» — хлопец уцяміў нешта нядобрае.

«Нічога. Папросту ўспомніў, як скруціў галаву юнаму пастару. Дарэчы, быў падобны да цябе».

Зігі не ведае, што сказаць.

«А за што вы яго... забілі?»

«За сабатаж. Дакладней, я ведаў, што не ён падраў правады, але той пастар узяў віну на сябе».

Зігі ціхенька адхіснуўся ад Дытрыха. Падаўся да дзвярэй, не спускаючы спалоханых вачэй з забойцы.

Дзея 2

«Даруй мне, Вольфе, што я крыўджу цябе», — прызнаецца Дытрых.

«Ды чаго там, — сэрца Ляцягіна ўскалыхнулася, ён стараецца ўспомніць, калі ў яго апошні раз прасілі прабачэння, — ты хаця б не называеш мяне паліцаем і буржуем».

«Зігі пазбягае мяне пасля таго, як я пра Клімента расказаў».

«Ідыёт! Ты б яшчэ расказаў, што загадваў вешаць вязняў!» — гаркнуў Ляцягін.

Дытрых спужаўся, а Ляцягін пашкадаваў, што даў волю свайму характару.

«А што? Хай ведае, — уздыхае Дзірк. — Зігі хвастом ходзіць за мной, а ён мне Клімента нагадвае. Я не мог спакойна глядзець хлопцу ў вочы. Ён жа думае, што я добры...»

«Ну а цяпер ты зусім не будзеш глядзець яму ў вочы! У нашым становішчы таварышамі раскідвацца нельга».

Дзея 3

Фрыда глядзіць халоднымі бурштынавымі вачыма ў вочы Ляцягіну.

«Вольфе, дзе Дзірк? Ён не вяртаўся дадому пасля вашай размовы».

«Адкуль я ведаю?!»

Лязгнулі дзверы. Увайшоў Зігі. За ім шыбуе Дытрых. Яны трымаюцца наводдаль адзін ад аднаго. Фрыда і Ляцягін моўчкі праводзяць іх позіркам, пакуль абодва не знікаюць у пакоі Дытрыха.

Дытрых зачыніў дзверы на ключ. Зігфрыд сеў на крэсла. Дзірк, быццам непакліканы госць, застаўся ля дзвярэй.

«Ты хацеў са мной пагаварыць, Зігі».

«Мне здаецца, што я хутка памру», — ледзь стрымлівае слёзы хлопец.

«Магчыма. Слухай, я інжынер, які мог бы замяніць паламаную дэталь у ракеце, але не можа памяняць хворыя сасуды. Калі б я мог, я б аддаў табе свае».

Зігі плача. Дзірк не можа зразумець, што ён хоча.

«Што ты хочаш?» — спакойна пытаецца Дзірк, заклаўшы рукі за спіну.

«Жыць».

«І ўсё?»

Зігі выцірае слёзы:

«А што? Здаецца, больш нічога не трэба».

Дытрых сядае на падлогу, чаго ніколі не робіць.

«Памятаеш таго пастара? Ведаеш, а ён жывы. Ён не можа быць мёртвым!»

Зігі дзівіцца, Дзірк працягвае:

«Ты не хвалюйся. У мяне было тры інфаркты, і кожны дзень маё хворае сэрца абпальвае мяне пякельным болем і часам я думаю, што вось цяпер я памру. Але смерць не наступае і я існую далей. Сапраўднае пекла. Аднойчы я сапраўды памру і… Божа, як я не хачу катавацца! Калі я мог хаця б на імгненне ўбачыць таго чалавека, якога я не варты, і якога я забіў...»

Дытрых валіцца на спіну, схапіўшыся за сэрца. Зігі кідаецца да дзвярэй, дрыжачай рукой церушыць ключом у замку.

«Не трэ людзей!.. Застанься…»

Галава Зігі баліць мацней, ён падлятае да Дзірка. Бы птушаняці, утыкаецца ў грудзі. Дытрых адчувае адказнасць перад гэтым чалавекам.

«Супакойся. Я з табой. Веру, што гэтым маё жыццё не скончыцца. Клімент ахвяраваў сабой за жыццё хворага таварыша, няхай не ведаў яго. Таму я веру, што ўсё сказанае ім пра Хрыста ёсць праўда. Слава Богу, што гэта так!»

Зігі паклаў галаву на грудзі таварыша і чуе гарачае дыханне з трапяткіх вуснаў Дзірка.

«Дзірк! Прабач, што асудзіў цябе, дарагі сябар».

ХРЫСТОВА СКРЫПКА

***

Шмат было музыкаў на зямлі, але такой скрыпкі, як у Хрыста, не было ніколі. Ён, Цар цароў, ходзіць па зямлі прамым шляхам. Носіць з Сабою хлеб і віно. «Прыйдзіце, вазьміце. Будзеце маімі дзецьмі!» — кажа Гасподзь. Але мы грэбуем Ім, Ягонай пакутай, Ахвярай Ягняці, Якое гінула на крыжы за грахі.

Яго гоняць, крыжуюць са дня ў дзень і зараз. А на шыі Ягоных вучняў вешаюць цэп, каб плясалі пад варожую дудку. Хто адлучыць нас ад любові Божай: скруха, ці ўціск, ці ганенне, ці голад, ці галеча, ці небяспека, ці меч?

А мы будзем жыць вечна!

Дзіўны стары чалавек

Гэта здарылася ўчора, калі я сустрэў аднаго старога святара ў царкве. На дварэ было холадна праз цяжкі зімовы вечар, а ў царкве цёпла й прыемна, і я зайшоў пагрэцца. Тады мяне й сустрэў гэты дзіўны стары чалавек.

Мы былі адны, і мне стала цікава пазнаёміцца з айцом. Ёсць нешта ў ягоных рухах такое, чаго я не бачыў у іншых людзях. Ёсць гэтая дабрыня і любоў, але не такая, якую я прывык бачыць у свеце. Я пераканаўся ў гэтым, калі старац глянуў праз плячо на мяне і ў ягоным поглядзе была тая любоў да мяне, абсалютна незнаёмага чалавека.

«Войча, — разгубіўся я, — можна пытанне?.. А чаму вы такі, які ёсць?»

Раптам гэты дзёрзкі зварот мне здаўся грубым і на імгненне я пашкадаваў, што ўзяўся пытацца. Але святар зусім не расстроіўся, наадварот: усміхнуўся, і ягоныя вочы жвава заблішчалі:

«Тое ж, сынку, не я такі. Я, насамрэч, злы й дзёрзкі чалавек, але Госпад любіць мяне й такога, грэшнага, і робіць маё сэрца жывым».

Мы яшчэ размаўлялі пэўны час, і я вярнуўся дадому больш жывым, чым быў дагэтуль.

Мой мілы сябар

Айцец ціхенька ступіў у шэры пакой. Фіранкі на вокнах — малады святар, ягоны сардэчны сябар, не падымаўся, каб упусціць святло ў памяшканне. Хлопец пасля набажэнства звaліўся з ног на лаву цяжка дыхаючы. Такое ўжо адбывалася, і ў гэтыя моманты старому айцу цяжка: што, калі юнак ужо не падымецца?.. Ляжыць і не можа варухнуцца: душа млее ў паўжывым целе.

Пачуўшы крокі любімага айца, расплюшчыў блакітныя вочы з гарэзлівай іскрынкай. Старац падышоў да юнага памочніка, сеў побач, абхапіў, узяў пакуль жывую, але ўжо непрытомную руку, у якой яшчэ пульсавала жывая кроў. Ён з трымценнем зазірае ў чэзлы праз хваробу твар.

Старац нерухомы. Святар бачыў многа скрухі, але ніяк не можа прывыкнуць, што людзей трэба адпускаць. Магчыма, ніхто не будзе яго так любіць і захапляцца ім, як гэты маленькі хлопчык. Мяккай поўнай далонню трымае сухенькую пясць. У роспачы паднімае вочы ўгору і... бачыць сінія пранізлівыя шкельцы вачэй, і вочы святара мякчэюць. Ніхто яшчэ не бачыў, каб з ягоных вачэй капалі слёзы.

«Мой мілы сябар...» — глуха гукае айцец.

Стары святар мякка ўтыкаецца вуснамі ва ўпалую шчаку хлопца, свайго памочніка. Адчувае, як у юнака б’ецца сэрца. Хлопец моўчкі ўзняў галаву, не вытрымаў, ураніў на мяккія грудзі.

Гарчычнае зерне

Гарчычнае зерне найменшае на зямлі з насення.
Але й яно вялікі плод прыносіць,
калі вырастае ў дрэва.
Каб дробнае зернейка ў тоўстае дрэва вырасціць,
Важна яго пасадзіць у добрую глебу,
Каб птушкі нябесныя яго не падзюбалі,
Чалавечыя ногі ў пыл не ўтапталі.
А потым маленькі парастак пільнаваць,
Даглядаць, паліваць, каб сонейка
раслінку не выпаліла,
Пустазелле выдзіраць з каранём,
Каб яно наша зерне не задушыла.
Калі дрэўца пачне пладаносіць,
важна яго ўдабраць,
Каб плод добры
прыносіла ў трыццаць,
шэсцьдзясят,
сто разоў большы за самое сябе.
Хрыстос, Які ўзрасціў
гэтае дрэўца Сваімі рукамі,
Аднойчы прыйдзе сабраць плады.
Ці знойдзе Ён дрэўца на месцы?
За гэта адкажуць я і ты.

Дыямент

Дыямент — самы каштоўны камень.
Сваёй прыгажосцю абавязаны Богу за тое,
Што Госпад працуе над ім,
Зачышчае ад брудных грахоў і лішняга пылу.
За тое, што Ён надае дыяменту
прыгожую форму.
Майстар ведае:
Кожны камень мусіць быць пэўных прапорцый.
«Сумна!» – скажаце вы, але неабходна,
Каб дыямент змог адлюстраваць святло,
Не рассеяўшы яго.
Калі стандарты парушыць,
камень не будзе блішчаць.
Мы не будзем парушаць Божае слова,
Каб несці святло ў гэты свет.

Сейбіт

Выйшаў сейбіт сеяць.
Сонца няшчадна паліць,
Камні ўпіваюцца ў босыя ногі,
Птушкі віхорам лунаюць у небе —
Чакаюць спажывы.
Кінуў сейбіт насенне
на пякучую глебу — нічога.
Трэба чакаць, пакуль узрасце.
Птушкі селі пад’есці.
Сейбіт кідае насенне ізноў.
Ізноў і ізноў ускідвае рукі, сеючы зерне.
Ён не глядзіць на гарачае сонца,
Каменную глебу
І птушак галодных.
Сейбіт выконвае Божае слова —
Ён працуе на ніве Гасподняй,
Аддаючы сэрца Хрысту.

Мовы

Даў Бог чалавеку язык,
І разам з ім — родную мову,
Чтоб Господу песни мы пели,
Каб разам дзяліліся думкамі,
І разом із рідними, друзями
Chwalili rodzimego Boga
Па-беларуску,
По-русски,
По-українському,
Po polsku
І іншымі роднымі мовамі.

Старыя святыя

Калі ты чытаеш старадаўнія Божыя кнігі
Адданых Божых пакутнікаў,
Якія кожны радок з цеплынёю пісалі,
Тады тваё забытае чужым чалавекам
Стамлённае дарогай жыцця
І параненае цяжкай нягодай яшчэ гарачае сэрца
Ажывае. Ізноў б’ецца ў грудзях
Як птушка, што прагне ў нябёсы,
І кліча сяброў за сабой.
Я веру, што тыя старыя паэты,
Што неслі светач любові стагоддзі,
Чакаюць мяне.
Любяць.
Любяць цябе такім, які ты ёсць —
Толькі аддай сэрца Богу.

Божае слова

Кніга цудоўная Біблія,
бо на пытанні жыцця
атрымаеш адказ, пачытаўшы яе.
Вобразы дрэваў нярэдка ўжываюцца ў ёй.
Дрэва азначае душу чалавека.
Лес прадстаўляе народ.
Бог пасадзіў на зямлі чалавека,
Каб плодным было існаванне стварэння.
Зычу разумнымі быць і не страціць
дарэмна жыццё.

Сонца праўды

Ноч. Лунае ў паветры халодны віхор.
Цішыня. Хруст пад капытам каня,
Дыханне дужай жывёлы
пакідае марознае воблака пары.
Выходзіць першы, белы.
Вершнік кагосьці шукае ў снезе.
Кагосьці маленькага, дробнага, непрыкметнага.
Таго, Хто гэты свет перамог без жалеза і зброі.
Яго ў снезе няма — Ён уваскрэс.
Калі б вершнік вочы ўзняў у начное паветра,
Ён бы ўбачыў, што прыйшоў ужо дзень,
І сонейка праўды ўзышло.
Той, хто няшчыра жыве, гоніць Хрыста,
Для таго ўсё жыццё — халодная ноч.
Але раптам прыйдзе Святло,
Каб высветліць таемнае, цёмныя куточкі душы.
І грэх, які чалавек прыхаваў нераскаяным,
Выступіць чорнымі плямамі на шыбе вакна,
Што гадамі хавалі пакой
ад Божага промня святла.
Таму і вы будзьце гатовыя,
бо ў якую гадзіну не думаеце,
Сын Чалавечы прыйдзе.
Хто ж верны і разумны раб,
Якога гаспадар ягоны паставіў
над слугамі сваімі,
Каб даваў ім ежу ў свой час?

Дабрашчасны той раб, якога гаспадар ягоны,
Прыйшоўшы застане, што робіць так,
Праўду кажу вам,
Што над усім маёнткам сваім паставіць яго.
А калі скажа ліхі раб той у сэрцы сваім:
«Не хутка прыйдзе гаспадар мой»,
І пачне біць субратоў сваіх,
і есці і піць з п’яніцамі, —
Дык прыйдзе гаспадар раба таго ў дзень,
У які ён не чакае, і ў гадзіну, у якую не ведае,
і разатне яго напалам,
І вызначыць яму аднолькавую долю
з крывадушнікамі:
Там будзе плач і скрыгат зубоў.

Коні

Дзесяць коней было ў гаспадара аднаго.
Дзесяць дужых жывёл цягалі вазы ў жніво.
Прыгожыя выглядам моцныя коні
Ганарыліся веліччу сваёй.
Працаўнікі не маглі саўладаць
З норавам ганарыстых жывёл.
Аднойчы найдужэйшы конь
Цягнуў воз у моры саспелага збожжа.
Агледзеў залатую прастору і гучна заржаў:
«Кожны конь — каваль свайго шчасця.
Чаму мы, дужыя жывёлы,
Працуем на кволага гаспадара
І дазваляем сябе цугляць,
Каб атрымаць карыта аўса.
Мы самі змаглі вырасціць ураджай,
І ён павінны належыць нам!»
Спрытна зламаўшы аглоблю,
Конь вырваўся на свабоду,
Клічучы за сабою сяброў.
Астатнія коні пабеглі за ім,
Аглоблі ломячы і сыплючы збожжа з вазоў.
Толькі адзін, самы худы і кволы,
Які любіў гаспадара
І якога не шкадавалі людзі,
Загарадзіў калёсамі дарогу на поле,
Каб дзікі табун не вытаптаў зерне.

І коні пабеглі далей па дарозе,
Прагнучы волі, далей ад людзей.
А гаспадар замест іх знайшоў іншых каней,
Што паслухмяна вазілі ў пуню збожжа.
Наперадзе іх хадзіў кволы,
Якога за адданасць гаспадару
Больш не прыніжалі людзі.

***

Узбіваю крыламі ізноў і ізноў па вадзе.
Чырвонае возера мочыць пёры ў віно
альбо кроў —
Не разбярэш пад промнямі захаду.
Чырвонае сонца тоне ў вадзе
Ледзяной, па-мёртваму ціхай.
Змрочная чорная глыбіня
Цягне лёгкую, кволую птушыную постаць.
Хачу да Цябе, хачу на неба,
Але не наважуся сказаць гэта...
Клекатаць
Клікаць
Крычаць
Ніхто не пачуе...
Ніхто, акрамя Цябе.

***

Калі ўпершыню ўбачыла Цябе,
Маё сэрца затрымцела.
Ціха і пяшчотна, як раслінка.
Не баюся, бо ведаю, што не затопчаш,
Не пакінеш, не падманеш.
Не стукнеш, бо любіш.

***

Спой са мной, мая птушка!
І хаця чужая зямля... спой.
Дзе буду я,
Успомню пра Цябе.
І ноч,
І дзень
Праведзены ў думках з Табой.
Я жадаю і прагну
Убачыць Цябе,
Мая птушка.
Няма больш Радзімы, акрамя Тваёй.
Тваё сэрца дадзена мне праз каханне.
Захаваю,
Абяцаю
    Сябру маёй душы.

Стандарты

Мяккія валасы кладуцца на Твае грудзі
У пошуках суцяшэння.
Я знаю Цябе, ды не ведаю ролі героя,
Якога іграю ў п'есе жыцця.
Хто ты, маленькі чалавек, які прагнеш любові?
Чаму ты худы, ходзіш управа і ўлева,
Ссутуліўшыся над сваёй бядой.
Ты не ўмееш жыць, ты не ўмееш граць —
Любы крытык скажа табе пра гэта.
Калі хочаш плакаць —
гнеў абуджаецца ў грудзях,
каб не выдаць слёзы.
Не хачу, каб ты плакаў, маленькая жывая істота,
Не магу глядзець, як ірвеш
Сваё шчырае сэрца болем скрухі праз гнеў...
Тваё сэрца ў цябе адно.
У нас адно...
Людзям дазволена крыўдзіць,
А табе нельга злаваць,
Так у людзей прынята лічыць:
Раззлаваўся — ты сам вінаваты, бо злы.
Стрымаўся — азначае,
Што надта слабы, каб абараніць сябе.
Двайныя стандарты людзей...

Разважанне на псальм 136

Спачатку ўзгадаем яго паводле перакладу Васіля Сёмухі:

1 Давідава. Над рэкамі Вавілона,
там сядзелі і плакалі мы, калі згадвалі пра Сіён.
2 На вербах пасярод яго павесілі мы свае арфы.
3 А тыя, што нас паланілі,
песняў ад нас патрабавалі,
а нашыя прыгнятальнікі — весялосці:
«паспявайце нам з песняў Сіёна».
4 Як нам спяваць Гасподнюю песню
на чужынскай зямлі?
5 Калі забуду цябе, Ерусаліме,
хай забудзе мяне правіца мая;
6 хай прыліпне язык мой да паднябення,
калі помніць цябе я ня буду,
калі не пастаўлю Ерусаліма
на чале весялосці маёй.
7 Прыгадай, Госпадзе, сынам Эдомавым
дзень Ерусаліма, калі казалі яны:
«руйнуйце, руйнуйце да падмурка яго».
8 Дачка Вавілона, спусташальніца!
дабрашчасны, хто ўдзеліць табе за тое,
што зрабіла ты нам!
9 Дабрашчасны, хто возьме й заб'е
немаўлятак тваіх аб камень!

Псальм распавядае пра людзей, якія адмовіліся спяваць Божыя песні людзям, што не цэняць Госпада і смяюцца з Яго. Гэты псальм заўсёды быў знакавы для мяне.

Ведаеце, у мяне ёсць скрыпка. У яе чатыры струны, якія часам трэба падстройваць. І каб наладзіць скрыпку, трэба памятаць гукі і мець музычны слых. Ёсць хрысціянская песня «Струн души рука Христа касается», і наша душа сапраўды струны, якія наладзіць можа толькі Бог. Для гэтага чалавеку трэба поўнасцю аддаць сэрца Яму, і толькі тады Госпад сыграе на нас, Сваіх скрыпках, Сваю музыку.

Я вучылася ў школе з музычным ухілам і ў нашым класе было некалькі вучняў, якія таксама гралі на скрыпцы. Магчыма, вы бачылі, што скрыпкі захоўваюцца ў чорных футлярах. Аднойчы мы з адной дзяўчынай пераблыталі інструменты. Ужо дома, расшпіліўшы футляр, я ўбачыла, што скрыпка не мая. Але мне трэба было трэніравацца, і я ўзяла чужую скрыпку і спрабавала сыграць. Але ў мяне нічога не атрымалася, бо яна гучала іначай, чым мая.

У кожнай скрыпкі свой голас. Наколькі ж чалавек больш складаны за скрыпку, і як часта мы псуём музыку? І тады мы ўспамінаем Госпада і крыўдзімся на Яго, што мы не маем шчасця.

ЗМЕСТ

Замест прадмовы 3

ЦЕНЬ ЧОРНАГА БУСЛА 5

АКТ 0 **Замест пролагу 7**

АКТ 1 **Сэрца святара 11**

Дзея 1 Погляд старога біскупа 13

Дзея 2 Варфаламееўская ноч 23

АКТ 2 **Цень сябе самога 31**

Дзея 1 Айцец Станіслаў 33

Дзея 2 Царкоўнікі 43

АКТ 3 **Здрада веры 51**

Дзея 1 Пагоня 53

Дзея 2 Айцы 61

Дзея 3 Бітва на Нямізе 73

КРЫЖ 78

ДЫЯРЫУШ 84

ТАМ, ЗА ДЗВЯРЫМА 92

ІСУС, СЫН НАВА 98

ЭВА ФАЎСТ **103**

АКТ 1 **Царкоўніцы** **105**

АКТ 2 **Вялікае перасяленне**

Дзея 1 111

Дзея 2 118

АКТ 3 **Ноч расстраляных паэтаў**

Дзея 1 121

Дзея 2 123

Дзея 3 127

АКТ 4 **Трагедыя Фаўстаў**

Дзея 1 129

Дзея 2 131

АКТ 5 **Дзеля Хрыста дыхаем, дзеля Хрыста жывём** **137**

ФАУ **141**

АКТ 1 **Страшнае мінулае**

Дзея 1 143

Дзея 2 145

Дзея 3 146

Дзея 4 149

Дзея 5 150

Дзея 6 151

АКТ 2 **Адраджэнне духа**

Дзея 1 153

Дзея 2 155

Дзея 3 156

ХРЫСТОВА СКРЫПКА 158

Шмат было музыкаў 159
Дзіўны стары чалавек 160
Мой мілы сябар 161
Гарчычнае зерне 162
Дыямент 163
Сейбіт 164
Мовы 165
Старыя святыя 166
Божае слова 167
Сонца праўды 168
Коні 170
Узбіваю крыламі ізноў 172
Калі ўпершыню 173
Спой са мной, мая птушка! 174
Стандарты 175
Разважанне на псальм 136 176